КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В. Макоўчык
"07" 06 2021 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2-1/вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:

**1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура**
**1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура.**
**Замежная мова (з указаннем мовы)**

2021 г.

2

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-02 03 03 - 2013 установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 87 і вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

С. У. Шахоўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А. П. Чарнякевіч, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук;

В. А. Шклярык, старшы навуковы супрацоўнік аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі філіяла "Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа" ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", кандыдат філалагічных навук

**УЗГОДНЕНА**
Дырэктар ДУА
"Суткаўскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад-базавая школа" __________ Т. У. Бандарэнка

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 10 ад 20.04.2021 г.)

Загадчык кафедры __________ Д. В. Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 6 ад 26. 05 2021 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела __________ С. А. Старадуб

Дырэктар бібліятэкі __________ Н. П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы”** – абагульніць і сістэматызаваць веды навучэнцаў па тэарэтычных пытаннях гісторыі беларускай мовы; развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнта і яго лінгвістычную кампетэнцыю ў гістарычным аналізе моўных фактаў.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы”:**

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя веды па гісторыі развіцця фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу беларускай мовы;

– даць навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя веды пра станаўленне літаратурнай мовы з уласцівай ёй функцыянальна-стылявой дыферэнцыяцыяй і адпаведнай сістэмай моўна-выяўленчых сродкаў;

– абапіраючыся на навуковыя і вучэбныя выданні, паказаць, якія суадносіны існавалі паміж літаратурнай мовай і дыялектамі, а таксама літаратурнымі мовамі іншых народаў (найперш суседніх);

– раскрыць заканамернасці ўпарадкавання, нармалізацыі і кадыфікацыі беларускай літаратурнай мовы як складанай шматузроўневай сістэмы;

– сфарміраваць устойлівыя навыкі гістарычнага аналізу моўных фактаў;

– паказаць, якую ролю ў працэсе станаўлення літаратурнай мовы адыгрывалі пісьменнікі, грамадскія дзеячы, навукоўцы;

– развіць і ўмацаваць навыкі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры каменціраванні беларускіх помнікаў пісьменства.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай мовы” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін і займае сярод іх важнае месца. Вучэбная дысцыпліна дае ўяўленне аб станаўленні беларускай мовы, разглядае розныя яе стылі ў розныя гістарычныя эпохі, шляхі фарміравання, развіцця і ўдасканалення беларускай літаратурнай мовы. Тэарэтычныя веды і практычныя ўменні і навыкі, набытыя студэнтамі пры вывучэнні курса “Гісторыя беларускай мовы” адыгрываюць важную ролю ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніка-філолага: знаёмяць студэнтаў з развіццём беларускай мовы на розных этапах яе фарміравання, даюць уяўленне аб упарадкаванні, нармалізацыі і кадыфікацыі літаратурных норм.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*

Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Гісторыя беларускай мовы” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў. Гэта самастойная лінгвістычная дысцыпліна, якая мае свой прадмет вывучэння, метады і прыёмы аналізу.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускай мовы” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Стараславянская мова”, “Дыялекталогія беларускай мовы”.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый.***

Студэнт павінен:

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць метадамі навукова-педагагічнага даследавання.

АК-3. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-7. Мець навыкі, якія звязаны з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

Студэнт павінен:

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчыцкай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі разнастайных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай мовы" студэнт павінен:

***ведаць***:

– працэс станаўлення і развіцця старабеларускай мовы, адметныя асаблівасці фанетычнай сістэмы і граматычнага ладу беларускай мовы ў розныя перыяды яго гісторыі;

– гісторыю беларускай графікі і кнігадрукавання;

***умець:***

– чытаць і перакладаць старажытныя пісьмовыя тэксты, аналізаваць моўныя і стылістычныя асаблівасці пісьмовых помнікаў;

***валодаць:***

– навыкамі гістарычнага аналізу моўных фактаў, практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры каментаванні беларускіх пісьмовых помнікаў;

– уменнем разглядаць сучасныя моўныя факты ў іх гістарычнай дынаміцы.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай мовы" на 4 курсе запланавана 204 гадзіны, з якіх 84 гадзіны – аўдыторныя заняткі і 84 гадзіны – самастойная праца.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін па семестрах на дзённым аддзяленні на 4 курсе:*

| семестр | усяго гадзін | аўдыторныя | лекцыі | практычныя | КСР | | самаст. праца | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | лк | пр | | |
| 7 | 84 | 42 | 22 | 16 | 2 | 2 | 42 | залік |
| 8 | 120 | 42 | 20 | 18 | 2 | 2 | 42 | экзамен |

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы ў 8 семестры: тэма “Мова дзелавых помнікаў XIV – XVII стст. (граматы, статуты, судовыя дакументы)” – рэйтынгавая кантрольная № 1, тэма “Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст.” – рэйтынгавая кантрольная № 2, тэма “Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30-я гг. XX ст.” – рэйтынгавая кантрольная № 3.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 1. УВОДЗІНЫ

**1.1. Гісторыя беларускай мовы як раздзел мовазнаўства і вучэбная дысцыпліна.**

Прадмет і задачы курса. Сувязь гісторыі мовы з гісторыяй народа, яго культурай і літаратурай. Месца курса “Гісторыя беларускай мовы” ў сістэме іншых раздзелаў навукі аб беларускай мове.

Паняцце літаратурнай мовы і гістарычная зменлівасць яго зместу ў розныя эпохі развіцця грамадства. Вусная і пісьмовая формы літаратурнай мовы. Паняцце нормы літаратурнай мовы ў гістарычным аспекце.

Паняцце “стыль літаратурнай мовы”. Дынаміка стыляў.

Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы, прынцыпы адбору і прыёмы іх навуковай інтэрпрэтацыі.

Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Агульнаўсходнеславянская літаратурная мова (XI – пачатак XIV стст.) – пачатак літаратурна-моўнай гісторыі усходніх славян (беларусаў, рускіх, украінцаў). Старабеларуская літаратурная мова (XIV – XVIII стст.). Новая беларуская літаратурная мова (XIX – XXI стст.).

## 2. ГІСТАРЫЧНАЯ ФАНЕТЫКА

**2.1. Гукавая сістэма агульнаўсходнеславянскай мовы дапісьмовай эпохі.** Структура склада. Актуальнасць тэндэнцыі да адкрытасці складоў і складовага сінгарманізму. Абмежаванасць дапушчальных груп зычных. Характар націску.

Сістэма галосных, іх класіфікацыя і характарыстыка. Галосныя пярэдняга і непярэдняга рада. Галосныя поўнага ўтварэння і рэдукаваныя, моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных. Галосныя ў пачатку слова.

Сістэма зычных. Цвёрдыя, памякчоныя і спрадвечна мяккія зычныя. Заканамернасць спалучэння зычных з галоснымі гукамі ў складзе.

**2.2. Фанетычныя працэсы дапісьмовай эпохі, адлюстраванне іх вынікаў у беларускай мове.** Фанетычныя змяненні, агульныя для ўсіх славянскіх моў і ўласцівыя толькі мове ўсходніх славян; неаднолькавасць вынікаў фанетычных працэсаў у розных славянскіх мовах.

Пераходнае памякчэнне заднеязычных (першая, другая і трэцяя палаталізацыі), узнікненне чаргаванняў заднеязычных з шыпячымі і свісцячымі. Змяненне спалучэнняў [**гт**], [**кт**] перад галоснымі [**і**], [**ь**].

Лёс спалучэнняў зычных з наступным [**j**] (ётам). Змяненне заднеязычных, пярэднеязычных і губных у спалучэнні з [**j**]. Паходжанне афрыкаты ***дж*** у беларускай мове. Развіццё мяккасці санорных і спалучэння “губны + [**л’**]” на месцы спалучэння санорных і губных з [**j**]. Змяненне спалучэнняў зычных перад [**j**].

Дысіміляцыя ў спалучэннях **дт**, **тт** і звязанае з ёй чаргаванне [**д**] // [**с’**], [**т**] // [**с’**]. Спрашчэнне груп зычных і яго вынікі ў беларускай мове.

Спалучэнні ***ор***, ***ол*** перад зычным у пачатку слова. Змяненне іх у ***ра***, ***ла*** або ***ро***, ***ло*** ў залежнасці ад інтанацыі. Змяненне спалучэнняў ***ор***, ***ол***, ***ер***, ***ел*** у становішчы паміж зычнымі. Развіццё першага поўнагалосся. Беларускія варыянты поўнагалосных спалучэнняў.

Насавыя галосныя, прычыны і фанетычныя ўмовы іх утварэння. Змяненне насавых галосных. Чаргаванні гукаў у беларускай мове, звязаныя з гісторыяй насавых галосных.

Страта [**j**] перад [**э**] у пачатку слова, змяненне [**э**] у [**о**] ва ўсходнеславянскіх мовах. Умовы пераходу пачатковага [**э**] у [**о**]. Адлюстраванне гэтага працэсу ў лексічных запазычаннях старажытнай пары. Чаргаванні галосных.

**2.3. Фанетычныя працэсы пісьмовай эпохі.** Гісторыя рэдукаваных галосных [**ъ**], [**ь**]. Храналогія, прычыны і фанетычныя ўмовы страты рэдукаваных. Знікненне іх у слабай пазіцыі і супадзенне з [**о**], [**э**] у моцнай пазіцыі. Пераўтварэнне галосных [**о**], [**э**], што ўзніклі з рэдукаваных, у галосны [**а**] пад уплывам акання.

Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у вакалізме. Перабудова гукавой структуры слова. Бегласць галосных. Прычыны адсутнасці беглых галосных у адпаведных фанетычных пазіцыях. Варыянты прыназоўнікаў і прыставак, суфіксаў і каранёў, абумоўленыя стратаю рэдукаваных.

Прыстаўныя галосныя [**і**], [**о** (**а**)] перад санорнымі [**р**], [**л**], [**м**], [**в**] у пачатку слова. Фанетычныя ўмовы развіцця гэтай з'явы. Узнікненне ўстаўных галосных перад санорнымі ў новых канцавых спалучэннях зычных.

Падаўжэнне галосных [**о**], [**э**] у новых закрытых складах. Адлюстраванне гэтага працэсу ў сучасных гаворках поўдня Беларусі.

Спалучэнні рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] з плаўнымі ў становішчы паміж зычнымі. Плаўныя з наступнымі рэдукаванымі. Розны вынік змянення такіх спалучэнняў ва ўсходнеславянскіх мовах. Развіццё чаргаванняў [***ро***] // [***ры***], [***ло***] // [***лы***], [***ле***] // [***лі***] ў беларускай мове. Змяненне рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у моцнай пазіцыі перад плаўнымі (у словах тыпу *търгъ, шьлкъ, вълкъ*). Другое поўнагалоссе. Спецыфічнасць фанетычных умоў для яго развіцця. Непаслядоўнасць гэтай фанетычнай з'явы.

Гісторыя рэдукаваных [**ы**], [**і**]. Слабая і моцная пазіцыі рэдукаваных [**ы**], [**і**]. Неаднолькавасць вынікаў іх змянення ва ўсходнеславянскіх мовах.

Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у кансанантызме беларускай мовы. Утварэнне ў пачатку, у сярэдзіне і на канцы слоў новых груп зычных, звязанае са стратаю рэдукаваных [**ъ**], [**ь**], і ўзнікненне ў іх умоў развіцця разнастайных фанетычных змяненняў. Другое спрашчэнне груп зычных, адлюстраванне яго беларускай арфаграфіяй. Страта канцавога [**л**] у дзеяслоўных формах і назоўніках.

Змяненне зычнага [**в**] на [**ў**]. Характар старажытнага [**в**]. Змяненне цвёрдага [**л**] на [**ў**], фанетычныя ўмовы працэсу, адлюстраванне яго вынікаў у помніках. Нефанетычны пераход [**л**] у [**ў**]. Зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў.

З'явы асіміляцыі ў новых спалучэннях зычных. Поўная і няпоўная, рэгрэсіўная і прагрэсіўная асіміляцыя. Прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх. Прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх. Прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых. Прыпадабненне шыпячых зычных да свісцячых. Зліццё (сцяжэнне) аднолькавых і аднатыпных зычных. Прыпадабненне ў спалучэнні ***дн***. Узнікненне падоўжаных зычных. Дысіміляцыя ў новых групах зычных. Змяненне звонкіх зычных на канцы слоў у сувязі з падзеннем рэдукаваных.

Фанетычныя змяненні, не абумоўленыя стратаю рэдукаваных. Адметны характар іх вынікаў і месца ў станаўленні сістэмы спецыфічных рыс беларускай фанетыкі.

Змяненні галоснага [**ě**] (ѣ). Дыфтангічны характар гука [**ě**] (ѣ). Лёс галоснага [**ě**] (ѣ) ва ўсходнеславянскіх мовах. Супадзенне [**ě**] (ѣ) з галосным [э] у беларускай мове.

Выпадкі замены [ě] (h) галосным [і] у літаратурнай мове. Сляды былога [ě] (h) у паўднёва-заходнім дыялекце.

Змяненне [э] на [**о**]. Пазіцыйная абумоўленасць пераходу [э] у [**о**]. Непаслядоўнасць вынікаў змянення [э] на [**о**] у сучаснай беларускай мове, яе прычыны. Пераход націскнога [э] у [**о**] пасля мяккіх і зацвярдзелых зычных на канцы слоў.

Аканне. Тыпы акання ў сучасных беларускіх гаворках. Гіпотэзы адносна часу і месца ўзнікнення акання. Аканне – арфаэпічная і арфаграфічная норма беларускай літаратурнай мовы.

Страта канцавога [**і**] у дзеяслоўных формах. Адпадзенне галосных [**у**], [э] у канчатках ускосных склонаў назоўнікаў і прыметнікаў. Зліццё галосных на стыку марфем і ў канчатках прыметнікаў. Змяненне [**і**] на [**й**] у становішчы пасля галосных.

Далейшае памякчэнне зычных [**д'**], [**т'**]. Узнікненне дзекання і цекання. Погляды лінгвістаў (А.А.Шахматаў, Я.Ф.Карскі) на паходжанне дзекання і цекання ў беларускай мове.

Развіццё прыстаўных (пратэтычных) зычных [**в**], [**j**], [**г**].

Зычны [**г**] у гісторыі беларускай мовы. Зацвярдзенне шыпячых, змяненні ў вымаўленні зычнага [**ц**], страта мяккаэрасці. Паходжанне зычнага [**ф**] у беларускай мове. З'яўленне ўстаўных заднеязычных (у інфінітыве *бегчы, секчы*). Страта канцавога [**j**] (ёта) у прыметніках мужчынскага роду і ў 2-ой асобе загаднага ладу аднаскладовых дзеясловаў. Непераходнае памякчэнне заднеязычных [**г**], [**к**], [**х**]; змяненні ў артыкуляцыі [**г**], [**к**], [**х**], працягласць пашырэння працэсу. Змяненне спалучэнняў [**дс**], [**тс**] на [**ц**] падоўжаны ([**цц**]) у лічэбніках, зваротных дзеясловах.

## 3. ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА

Агульная характарыстыка граматычнага ладу агульнаўсходнеславянскай мовы дапісьмовай эпохі і часу ўзнікнення першых пісьмовых помнікаў. Часціны мовы. Дыферэнцыяцыя іменных часцін мовы.

**3.1. Назоўнік.** Граматычныя катэгорыі назоўнікаў агульнаўсходнеславянскай мовы. Катэгорыя роду, ліку і склону. Змяненне граматычнага роду некаторых назоўнікаў. Страта формы парнага ліку назоўнікаў, яго рэшткі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове і гаворках. Клічны склон назоўнікаў, яго лёс ва ўсходнеславянскіх мовах. Звужэнне яго функцыі ў беларускай мове. Катэгорыя адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці.

Старажытная сістэма скланення назоўнікаў. Тыпы скланення назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў жаночага і мужчынскага роду з асновай на **-ā-*, **-jā-*. Скланенне назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду з асновай на **-ō-*, **-jō-*. Скланенне назоўнікаў жаночага і мужчынскага роду з асновай на **-ĭ-* (*і* кароткае). Скланенне назоўнікаў мужчынскага роду з асновай на **-ŭ-* (*у* кароткае). Скланенне назоўнікаў жаночага роду з асновай на **-ū-* (у доўгае). Скланенне назоўнікаў з асновай на зычныя гукі.

Асаблівасці скланення назоўнікаў. Адметнасць склонавых канчаткаў у залежнасці ад асновы мяккай, цвёрдай або на заднеязычны і граматычнага роду назоўнікаў. Змяненні канчаткаў кожнага тыпу скланення ў працэсе фарміравання беларускай мовы. Пераразмеркаванне старажытных тыпаў скланення назоўнікаў. Паходжанне рознаскланяльных назоўнікаў. Узаемаўплыў склонавых формаў

назоўнікаў розных тыпаў. Вытлумачэнне наяўнасці варыянтных канчаткаў назоўнікаў у сучаснай беларускай мове.

Множны лік назоўнікаў. Працэс аб’яднання ў множным ліку розных тыпаў скланення старажытнага перыяду. Замацаванне ў склонавай парадыгме назоўнікаў множнага ліку сучаснай беларускай мовы пераважна канчаткаў былога скланення з асновай на ***-ā-***, ***-jā-***. Пашырэнне канчаткаў роднага склону ***-оў***, ***-аў*** назоўнікаў былой асновы на ***-й-*** на ўсе сучасныя тыпы скланення. Адлюстраванне працэсу уніфікацыі формаў множнага ліку ў пісьмовых помніках.

**3.2. Займеннік.** Разрады займеннікаў паводле адметнасці ў граматычных катэгорыях: 1) асабовыя і зваротны; 2) неасабовыя. Сістэма скланення і словаўтварэння займеннікаў старажытнага перыяду. Гісторыя скланення асабовых займеннікаў і зваротнага *себе.* Энклітычныя і суплетыўныя формы як характэрная асаблівасць у скланенні гэтых займеннікаў. Ужыванне і лёс энклітычных займеннікаў. Гісторыя займенніка 3-й асобы. Утварэнне сучасных формаў займеннікаў.

Гісторыя скланення неасабовых займеннікаў. Мяккая, цвёрдая і на заднеязычны разнавіднасць неасабовых займеннікаў. Асаблівасць скланення займеннікаў *вьсь, вься, вьсе.* Характар змяненняў у склонавых канчатках займеннікаў мяккай разнавіднасці, страта родавых адрозненняў у канчатках множнага ліку. Уплыў склонавых канчаткаў мяккай разнавіднасці на склонавыя формы неасабовых займеннікаў цвёрдай разнавіднасці ў працэсе станаўлення склонавай парадыгмы неасабовых займеннікаў сучаснай беларускай мовы. Паходжанне сучасных склонавых формаў займеннікаў *той, тая, тое.* Фанетычныя змяненні і змяненні па аналогіі ў склонавых формах займеннікаў *вьсь, вься, вьсе.* Скланенне пытальных займеннікаў *къто, чьто.*

**3.3. Прыметнік.** Граматычныя катэгорыі прыметнікаў у старажытнасці. Іменныя (кароткія) і займеннікавыя (поўныя) прыметнікі. Гісторыя іменных прыметнікаў, іх скланенне. Утварэнне займеннікавых прыметнікаў. Дыферэнцыяцыя сінтаксічных функцый іменных і займеннікавых прыметнікаў. Утварэнне сучасных склонавых формаў займеннікавых (поўных) прыметнікаў.

Фанетычныя змяненні ў канчатках займеннікавых прыметнікаў, іх роля ў фарміраванні склонавай парадыгмы поўных прыметнікаў сучаснай беларускай мовы. Выпрацоўка агульных склонавых формаў прыметнікаў мужчынскага, жаночага і ніякага роду ў множным ліку. Супадзенне ў беларускай мове формы меснага склону адзіночнага ліку прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду з творным.

Прыналежныя прыметнікі ў агульнаўсходнеславянскай мове, іх утварэнне і ўжыванне. Страта іменнымі (кароткімі) прыналежнымі прыметнікамі ўскосных склонавых формаў. Пашырэнне прыналежных прыметнікаў у сучаснай беларускай мове.

Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Утварэнне вышэйшай ступені параўнання. Паходжанне формаўтваральнага суфікса. Іменныя (кароткія) і займеннікавыя (поўныя) формы вышэйшай ступені параўнання. Страта ўскосных склонавых формаў іменнымі прыметнікамі вышэйшай ступені параўнання. Пераход у беларускай мове іменнага (кароткага) прыметніка вышэйшай ступені параўнання ў назоўным склоне ў разрад прыслоўяў. Лёс займеннікавага (поўнага) прыметніка вышэйшай ступені параўнання ва ўсходнеславянскіх мовах. Развіццё найвышэйшай ступені параўнання ў беларускай мове.

**3.4. Лічэбнік.** Станаўленне лічэбніка як часціны мовы. Суадноснасць лічэбнікаў з іншымі часцінамі мовы. Групы колькасных лічэбнікаў у агульнаўсходнеславянскай мове. Сістэма іх скланення. Страта колькаснымі лічэбнікамі катэгорыі ліку і роду і выкліканыя ёю змяненні ў сістэме скланення лічэбнікаў. Станаўленне сучаснай сістэмы скланення лічэбнікаў у беларускай мове.

Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі. Утварэнне складаных лічэбнікаў *адзінаццаць – дзевятнаццаць, дваццаць, трыццаць, пяцьдзесят, шэсцьсот*; суадноснасць іх са словазлучэннямі. Лічэбнікі *сорак* і *дзевяноста*. Фанетычныя змяненні, што адбыліся ў складаных лічэбніках. Старажытныя формы парнага і множнага ліку лічэбнікаў, што выступаюць састаўнымі часткамі складаных лічэбнікаў *дваццаць, трыццаць, пяцьдзесят, дзвесце, трыста, чатырыста, семсот* і інш.

Дробавыя лічэбнікі (*полтора, полтретя, полшеста, полпятаста*). Зборныя лічэбнікі ў старабеларускай літаратурна-пісьмовай мове.

Скланенне парадкавых лічэбнікаў. Знікненне скланення іменных парадкавых лічэбнікаў.

**3.5. Дзеяслоў. Дзеепрыметнік.** Сістэма дзеяслоўных формаў агульнаўсходнеславянскай мовы да XI ст. Асноўныя граматычныя катэгорыі дзеяслова: трыванне, стан, час, лад, асоба, лік. Сістэма формаў часу і трывання. Значэнне стану. Адсутнасць граматычнага выражэння катэгорыі стану ў спрагальных формах дзеяслова. Наяўнасць дыферэнцыяцыі станаў у дзеепрыметніках.

Сістэма часавых формаў дзеяслова. Простыя і складаныя (аналітычныя) формы часу. Лады дзеяслова. Класы дзеясловаў у агульнаўсходнеславянскай мове.

Змяненні ў формах дзеясловаў цяперашняга часу. Нетэматычныя і тэматычныя дзеясловы. Спражэнне нетэматычных дзеясловаў. Адметнасць канчаткаў і адрозненні ў аснове асабовых формаў нетэматычных дзеясловаў. Страта нетэматычнага спражэння. Рэшткі яго ў сучаснай беларускай мове. Асабовыя канчаткі тэматычных дзеясловаў цяперашняга часу. Фанетычныя змяненні ў іх. Пашырэнне формы 3-й асобы адзіночнага ліку без -*ть* (-*ць*) у дзеясловах 1, 2 і 3-га класаў, захаванне -*ть* (-*ць*) у форме 3-й асобы адзіночнага ліку дзеясловаў 4-га класа. Непаслядоўнасць гэтага змянення ў беларускіх гаворках.

Гісторыя прошлага часу дзеясловаў. Простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквамперфект) формы прошлага часу. Значэнне аорыста, імперфекта, перфекта, плюсквамперфекта, іх суадноснасць з формамі трывання дзеяслова. Развіццё трыванняў і паступовыя змяненні ў сістэме прошлых часоў дзеяслова. Ранняя страта аорыста і імперфекта, адсутнасць гэтых часавых формаў у некаторых усходнеславянскіх граматах і ў помніках старажытнай беларускай мовы. Выкарыстанне былой асабовай формы аорыста (2 і 3-й асобы адзіночнага ліку) дзеяслова *быти* (часціцы бы) у сучаснай беларускай мове. Ужыванне перфекта ў старажытнай беларускай мове. Змяненне перфекта, утварэнне на яго аснове сучаснай формы прошлага часу. Ранняя форма плюсквамперфекта, выцясненне яе формай даўномінулага часу, што ўтваралася з іменнага дзеепрыметніка на -*л*- і перфекта дапаможнага дзеяслова *быти*. Страта плюсквамперфекта. Захаванне рэштак плюсквамперфекта ў сучаснай беларускай мове.

Формы будучага часу дзеясловаў у агульнаўсходнеславянскай мове. Будучы просты і будучы складаны час, іх значэнне. Агульнасць канчаткаў будучага простага і цяперашняга часу. Развіццё адрозненняў закончанага і незакончанага трыванняў як

асновы сэнсавага размежавання гэтых часавых формаў. Дзве складаныя формы будучага часу. Будучы складаны незакончанага трывання, варыянтнасць дапаможнага дзеяслова. Утварэнне сучаснага будучага складанага з дапаможным дзеясловам *быць*. Рэшткі будучага складанага з дапаможным дзеясловам *іму* ў сучасных паўднёвых гаворках беларускай мовы. Складаная форма будучага часу закончанага трывання, яе ўтварэнне і спражэнне. Паступовая страта будучага складанага закончанага трывання ва ўсходнеславянскіх мовах.

Умоўны лад. Утварэнне ўмоўнага (умоўна-пажадальнага) ладу шляхам спалучэння аорыста дапаможнага дзеяслова *быти* і дзеепрыметніка на *-л-* спрагальнага дзеяслова. Змяненне па асобах, значэнне ўмоўнага ладу. Страта дапаможным дзеясловам спражэння і пераўтварэнне формы 2 і 3-й асобы адзіночнага ліку аорыста *быти* ў нязменную часціцу. Адлюстраванне гэтага працэсу ў беларускіх помніках.

Загадны лад. Формы загаднага ладу тэматычных і нетэматычных дзеясловаў у старажытнасці. Утварэнне асабовых формаў, змены ў іх на працягу гісторыі беларускай мовы. Станаўленне сучаснага загаднага ладу. Развіццё апісальнай формы загаднага ладу 3-й асобы.

Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў, яго паходжанне і змяненне ў ім. Гісторыя супіна. Паходжанне зваротных дзеясловаў.

Сістэма дзеепрыметнікаў у агульнаўсходнеславянскай мове. Іменныя і займеннікавыя дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану. Страта іменнымі дзеепрыметнікамі незалежнага стану склонавых формаў і пераўтварэнне іх у дзеепрыслоўі. Гісторыя дзеепрыслоўяў у беларускай мове. Займеннікавыя формы дзеепрыметнікаў незалежнага стану. Абмежаванасць выкарыстання, паступовы заняпад іх у беларускай мове. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі. Дзеепрыметнікі залежнага стану іменнай і займеннікавай формы, іх лёс у беларускай мове. Дзеепрыметнікі на *-л-* у гісторыі беларускай мовы.

**3.6. Прыслоўе.** Фарміраванне прыслоўя як часціны мовы, станаўленне яго граматычных прыкмет. Групы прыслоўяў паводле паходжання і значэння. Прыслоўі займеннікавага паходжання, адыменныя і аддзеяслоўныя. Спосабы ўтварэння прыслоўяў. Фанетычныя змяненні ў прыслоўях займеннікавага паходжання. Этымалогія адыменных і аддзеяслоўных прыслоўяў. Развіццё складаных прыслоўяў.

**3.7. Службовыя словы.** Прыназоўнікі ў агульнаўсходнеславянскай мове. Простыя і вытворныя прыназоўнікі. Паступовае абмежаванне сферы выкарыстання некаторых прыназоўнікаў (*къ*, *изъ*, *о*). Змяненне сінтаксічнай функцыі некаторых прыназоўнікаў у беларускай мове. Развіццё беларускіх варыянтаў прыназоўнікаў (*съ – з*, *отъ – ад*, *въ – у*). Узнікненне на беларускай аснове новых прыназоўнікаў.

Марфалагічныя групы злучнікаў агульнаўсходнеславянскай мовы. Спосабы ўтварэння новых злучнікаў. Паходжанне злучнікаў сучаснай беларускай мовы.

**3.8. Просты сказ у старажытнай беларускай мове.** Спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Зборныя назоўнікі, асабовыя займеннікі, субстантываваныя часціны мовы, колькасна-іменныя і іншыя спалучэнні ў ролі дзейніка. Дзеяслоўны і іменны выказнік. Прэдыкатыўнае ўжыванне дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану ў агульнаўсходнеславянскай і старажытнай беларускай мове. Дапасаванне выказніка да дзейніка. Гісторыя канструкцыі “давальны самастойны”.

Выражэнне азначэння. Кароткія і поўныя прыметнікі, дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану ў ролі азначэння. Пашырэнне прыдатка ў старажытнай

беларускай мове. Перавага прыналежных прыметнікаў над прыіменным родным склонам назоўнікаў у выражэнні катэгорыі прыналежнасці ў старажытнай беларускай мове.

Асаблівасці кіравання. Развіццё прыназоўнікавых канструкцый на месцы старажытных беспрыназоўнікавых канструкцый. Паўторнае ўжыванне прыназоўнікаў. Рэшткі паўторнага ўжывання прыназоўнікаў у сучаснай беларускай мове.

Месца членаў простага сказа ў старажытнай беларускай мове. Прамы і адваротны парадак галоўных членаў сказа. Тыпы простых сказаў у гісторыі беларускай мовы.

**3.9. Складаны сказ.** Складаназлучаныя сказы. Злучальная, супраціўная, размеркавальная сувязь у злучнікавых сказах. Развіццё сказаў камбінаванай будовы ў беларускай мове. Бяззлучнікавыя сказы. Развіццё сродкаў падпарадкавання і тыпаў даданых сказаў у гісторыі беларускай мовы. Канструкцыі з простай і ўскоснай мовай.

## 4. АГУЛЬНАЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XI – XIII СТСТ.)

Паходжанне літаратурнай мовы ўсходніх славян. Экстралінгвістычныя прычыны распаду праславянскай і фарміравання агульнаўсходнеславянскай мовы. Лінгвістычныя фактары, якія паўплывалі на распад праславянскай сістэмы. Асноўныя дыферэнцыйныя працэсы і з’явы, якія прывялі да прыкметных адрозненняў паміж усходнеславянскай і іншымі групамі славянскіх моў. Асноўныя гіпотэзы ўзнікнення агульнаўсходнеславянскай літаратурнай мовы.

Асноўныя тыпы агульнаўсходнеславянскай літаратурнай мовы: рэлігійны (царкоўна-кніжны, царкоўна-літаратурны, кніжнаславянскі), свецка-мастацкі (народна-літаратурны), дзелавы (справавы). Роля стараславянскай мовы ў іх развіцці.

Рэлігійны тып агульнаўсходнеславянскай літаратурнай мовы. Асаблівасці твораў рэлігійнага пісьменства, перапісаных на ўсходнеславянскіх землях (“Наўгародскі трыпціх”, “Астрамірава евангелле”, “Зборнікі Святаслава”, “Мсціслава евангелле”, “Дабрылава, ці Сімяонава евангелле” і інш.). Арыгінальныя творы царкоўнай белетрыстыкі (“Казанне аб Барысе і Глебе”, “Жыціе Феадосія Пячэрскага”, словы, казанні, павучанні, малітвы епіскапа К.Тураўскага, творы А.Смаленскага і К.Смаляціча).

Дзелавы тып пісьменнасці. Асаблівасці пісьмовых тэкстаў (“Даравальная грамата кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча і яго сына Усевалада наўгародскаму Юр’еўскаму манастыру”, “Грамата Варлаама Хутынскага”, першы звод законаў на старажытнаўсходнеславянскіх землях “Руская праўда”).

Свецка-мастацкі тып агульнаўсходнеславянскай мовы. Характэрныя рысы перакладных (“Александрыя”, “Аповесць аб Акіру Прамудрым”, “Хроніка Георгія Амартала”, “Гісторыя іудзейскай вайны” Іосіфа Флавія) і арыгінальных мастацкіх твораў (“Слова аб палку Ігаравым”, “Павучанне” Уладзіміра Манамаха, “Аповесць мінулых гадоў” і інш.). Дыялектная дыферэнцыяцыя агульнаўсходнеславянскай мовы.

## 5. СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XIV – XVIII СТСТ.)

**5.1. Фарміраванне беларускай народнасці і яе мовы.** Гістарычныя прычыны ўзнікнення беларускай народнасці, фарміраванне яе мовы на аснове мясцовых

тэрытарыяльных дыялектаў. Розныя погляды вучоных на паходжанне беларускай мовы.

Лінгвонім *старабеларуская мова.* Месца старабеларускай мовы ў сацыяльна-камунікатыўнай прасторы Вялікага Княства Літоўскага. Літаратурна-пісьмовыя помнікі
XIV ст., працяг у іх традыцый усходнеславянскага пісьменства. Тэндэнцыя да збліжэння літаратурна-пісьмовай мовы з жывой народнай гаворкай. Графічныя і арфаграфічныя асаблівасці мовы помнікаў XIV ст.

Фарміраванне функцыянальна-стылістычных разнавіднасцей старабеларускай літаратурнай мовы. Перабудова сістэмы стылістычных разнавіднасцей, атрыманай у спадчыну ад усходнеславянскай мовы. Характарыстыка функцыянальных стыляў гэтага перыяду.

**5.2. Мова дзелавых помнікаў XIV – XVIII стст.** Жанравае багацце дзелавых помнікаў (статуты, судзебнікі, граматы, акты, позвы, запісы, укладанні, прывілеі, дагаворы, уставы, законы і інш.). Асаблівасці мовы дзелавых помнікаў (“Метрыка Вялікага Княства Літоўскага”, “Статут Вялікага Княства Літоўскага” і інш.), адлюстраванне ў іх фанетычных, граматычных, лексічных і фразеалагічных рыс жывой народнай мовы. Традыцыйныя сродкі і прыёмы дзелавога пісьменства. Значэнне дзелавога пісьменства для станаўлення старабеларускай мовы як сістэмы.

**5.3. Мова беларускіх летапісаў.** Своеасаблівасць сродкаў і прыёмаў летапісання. Фіксацыя асобных рыс беларускай мовы ў спісах летапісных зводаў агульнаўсходнеславянскага перыяду (“Радзівілаўскі летапіс”, “Летапіс Аўраамкі”). Беларускія летапісы канца XV – пачатку XVII ст. (“Віленскі”, “Супраслеўскі”, “Акадэмічны”, “Красінскіх”, “Патрыяршы”). Зместавыя і моўныя асаблівасці спісаў кароткай рэдакцыі (“Слуцкі”, “Віленскі”, “Супраслеўскі” і інш.) і спісаў пашыранай (поўнай) рэдакцыі (“Рачынскіх”, “Быхаўца” і інш.). Асаблівасці прыватных хронік і мемуараў (“Дзеннік” Фёдара Еўлашоўскага, “Баркалабаўскі летапіс” і інш.).

**5.4. Мова мастацкіх твораў XV – XVIII стст.** Моўна-стылістычныя асаблівасці арыгінальных мастацкіх тэкстаў (вершы Андрэя Рымшы, “Прамова Мялешкі”, “Ліст да Абуховіча”). Графіка-фанетычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя рысы перакладных аповесцей (“Александрыя”, “Аповесць пра Баву”, “Аповесць пра Трыстана”, “Троя”).

**5.5. Мова рэлігійных твораў XV – XVIII стст.** Пранікненне жывых моўных рыс у раннія рэлігійныя творы. Асаблівасці мовы апактыфічных твораў, блізкасць іх да жывой мовы (“Страсці Хрыстовы”, “Аповесць пра трох каралёў-вешчуноў”). Пераклады тэкстаў рэлігійнага зместу з арабскай мовы на беларускую (кітабы).

**5.6. Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст.** Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны ў Празе і Вільні. Пераклады тэкстаў Святога Пісання, мова перакладаў “Бібліі” Ф.Скарыны. Графічныя і арфаграфічныя асаблівасці выданняў Ф.Скарыны. Пачатак развіцця лексікаграфіі ў працах Ф.Скарыны. Прадмовы і пасляслоўі Ф.Скарыны, іх змест, ідэйная накіраванасць. Далейшае развіццё кнігадрукавання на Беларусі ў другой палове XVI – пачатаку XVII стст. Дзейнасць С.Буднага, В.Цяпінскага, І.Фёдарава, П.Мсціслаўца, братоў Мамонічаў. Скарынінскія традыцыі ў выдавецкай дзейнасці паслядоўнікаў першадрукара. Роля кнігадрукавання ў развіцці літаратурнай мовы і беларускай культуры.

Пераклады рэлігійнай літаратуры на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. (“Катэхізіс” С.Буднага, “Евангелле” В.Цяпінскага). Збліжэнне мовы рэлігійных твораў з жывой народнай гаворкай.

Роля царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Узнікненне “беларускай рэдакцыі” царкоўнаславянскай мовы. Другі паўднёваславянскі ўплыў на тэрыторыі Беларусі. Заняпад царкоўнаславянскай мовы на Беларусі, прычыны гэтага заняпаду.

**5.7. Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў XVI – XVII стст.** Лінгвістычныя выданні І.Фёдарава, Л.Зізанія, М.Сматрыцкага і іх роля ў фарміраванні норм кніжнаславянскай мовы. “Граматыка” І.Ужэвіча – першая спроба апісання старабеларускай літаратурнай мовы XVI – XVII стст.

Лексікаграфічныя працы XVI – XVII стст. (“Лексіс” Л.Зізанія, “Лексікон” П.Бярынды і інш.).

**5.8. Развіццё беларускага пісьменства канца XVI – XVIII стст.** Умовы развіцця беларускага пісьменства з канца XVI ст. Прычыны заняпаду беларускай мовы ў ВКЛ. Дзейнасць брацтваў, брацкія школы. Пранікненне ў творы беларускага пісьменства канца XVI – XVII стст. Паланізмаў і лацінізмаў; выкарыстанне тагачаснымі беларускімі пісьменнікамі стылістычных прыёмаў польска-лацінскага пісьма.

Беларуская мова ў інтэрмедыях XVII – XVIII стст. Адыход у іх ад традыцый старабеларускай літаратурнай мовы. Выкарыстанне ў помніках жывой беларускай гаворкі. Беларускія тэксты ў камедыі К.Марашэўскага.

## 6. НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XIX – XX СТСТ.)

**6.1. Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы ў XIX ст. Беларуская літаратурная мова ў творах пісьменнікаў XIX ст.** Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Палітыка расійскага ўрада па моўным пытанні. Мастацкая літаратура як галоўная сфера фарміравання і развіцця новай (сучаснай) беларускай літаратурнай мовы. Мова ананімных твораў першай паловы XIX ст. (вершы, гутаркі, паэмы “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”), яе сувязь з жывой народнай мовай, вусна-паэтычнай творчасцю народа. Асаблівасці мовы твораў беларускіх пісьменнікаў першай паловы XIX ст. (А.Рыпінскі, Я.Баршчэўскі, Я.Чачот, П.Багрым, В.Каратынскі, Л.Сыракомля і інш.). Роля В.Дуніна-Марцінкевіча і Ф.Багушэвіча ў фарміраванні беларускай літаратурнай мовы, іх погляды на беларускую мову. Развіццё беларускай літаратурнай мовы на аснове народных гаворак і вуснай народнай творчасці. Дыялектныя рысы ў мове твораў беларускай мастацкай літаратуры другой паловы XIX ст.

**6.2. Публіцыстыка на беларускай мове ў другой палове XIX ст.** Элементы публіцыстычнага стылю ў ананімных гутарках. “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага – першая беларуская газета. Спалучэнне сродкаў і прыёмаў размоўна-бытавога і газетна-публіцыстычнага стыляў.

**6.3. Беларуская літаратурная мова пачатку XX ст.** Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. і ўздым нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Першыя беларускія выдавецтвы і беларуская легальная прэса (“Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша ніва”, “Наша доля”, “Наша хата” і інш.). Роля газеты “Наша ніва” ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Правапісныя і граматычныя асаблівасці выданняў пачатку XX ст. Графічныя асаблівасці беларускіх выданняў гэтага часу:

выкарыстанне кірыліцы (“грамадзянкі”), лацінкі. Стылістычная абмежаванасць беларускай літаратурнай мовы пачатку XX ст.

**6.4. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў 1920-я гг**. Новыя сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця беларускай літаратурнай мовы пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. Пашырэнне грамадскіх функцый беларускай мовы. Беларусізацыя.

Змены ў структуры беларускай літаратурнай мовы ў паслякастрычніцкі перыяд. Далейшае развіццё і ўдасканаленне мастацкага і публіцыстычнага стыляў. Фарміраванне новых стыляў – навуковага і афіцыйна-дзелавога.

**6.5. Распрацоўка граматычных пытанняў беларускай мовы ў 20-30-я гг. XX ст.** Стварэнне беларускіх граматык (Э.Будзька, Б.Пачобка, Я.Станкевіч, А.Смоліч, Р.Абіхт і інш.). “Беларуская граматыка для школ” Б.Тарашкевіча – першая нарматыўная граматыка беларускай мовы, яе роля ў станаўленні арфаграфічных, граматычных нормаў беларускай мовы і ў фарміраванні лінгвістычнай тэрміналогіі.

Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926 г.) і рэформа беларускага правапісу 1933 г. Замацаванне адзінай графічнай сістэмы і арфаграфічных нормаў. Кадыфікацыя граматычных і арфаграфічных нормаў.

**6.6. Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30-я гг. XX ст.** Выпрацоўка беларускай нацыянальнай тэрміналогіі ў 20-30-я гг. XX ст. Дзейнасць Тэрміналагічнай камісіі. Стварэнне слоўнікаў дыялектнай і літаратурнай беларускай мовы. Узаемадзеянне літаратурнай мовы і народных гаворак.

**6.7. Асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы ў другой палове XX ст – пачатку XXI ст.** Звужэнне сфер выкарыстання беларускай мовы ў 1940 – 1970-я гг. Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу ў 1957 годзе. Моўная сітуацыя ў Беларусі ў 1980 – 1990-я гг. Закон “Аб мовах у Беларускай ССР” (1990); дзяржаўная праграма рэалізацыі закона. Статус беларускай мовы пасля рэферэндуму 1995 г. Беларуская літаратурная мова ў пачатку XXI ст. Блізкароднаснае двухмоўе на Беларусі. Далейшае ўдасканаленне нормаў беларускай літаратурнай мовы. Закон Рэспублікі Беларусь “Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008).

**Вучэбна-метадычныя карта вучэбнай дысцыпліны**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Самастойная праца | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | КСР | | | | |
| | | | | Лекцыі | Практ. зан. | | | |
| **ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (42 гадзіны)** | | **22** | **16** | **2** | **2** | **42** | | |
| 1. | **УВОДЗІНЫ (2 г.)** | **2** | | | | **2** | | |
| 1.1. | **Гісторыя беларускай мовы як раздзел мовазнаўства і вучэбная дысцыпліна. (2 г.)** | **2** | | | | **2** | | |
| 1.1.1. | Прадмет і задачы курса. Сувязь гісторыі мовы з гісторыяй народа, яго культурай і літаратурай. Месца курса ў сістэме іншых раздзелаў навукі аб беларускай мове. Паняцце літаратурнай мовы і гістарычная зменлівасць яго зместу ў розныя эпохі развіцця грамадства. Вусная і пісьмовая формы літаратурнай мовы. Паняцце нормы літаратурнай мовы ў гістарычным аспекце. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы, прынцыпы адбору і прыёмы іх навуковай інтэрпрэтацыі.<br>Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Агульнаўсходнеславянская літаратурная мова (XI – пачатак XIV стст.) – пачатак літаратурна-моўнай гісторыі усходніх славян (беларусаў, рускіх, украінцаў). Старабеларуская літаратурная мова (XIV – XVIII стст.). Новая беларуская літаратурная мова (XIX – XXI стст.). | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1], [3] | |
| 2. | **ГІСТАРЫЧНАЯ ФАНЕТЫКА (16г.)** | **8** | **6** | **2** | | **14** | | |
| 2.1. | **Гукавая сістэма агульнаўсходнеславянскай мовы дапісьмовай эпохі (2 г.)** | **2** | | | | **4** | | |
| 2.1.1. | Сістэма галосных, іх класіфікацыя і характарыстыка. Галосныя пярэдняга і непярэдняга рада. Галосныя поўнага ўтварэння і рэдукаваныя, моцная і слабая пазіцыя рэдукаваных. Сістэма зычных. Цвёрдыя, памякчоныя і спрадвечна мяккія зычныя. Заканамернасць спалучэння зычных з галоснымі гукамі ў складзе. Структура склада. Актуальнасць тэндэнцыі да адкрытасці складоў і складовага сінгарманізму. Характар націску. | 2 | | | | 4 | [1], дап. [3] | |
| 2.2. | **Фанетычныя працэсы дапісьмовай эпохі, адлюстраванне іх вынікаў у беларускай мове (4 г.)** | **2** | **2** | | | **4** | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.2.1. | Фанетычныя змяненні, агульныя для ўсіх славянскіх моў, і ўласцівыя толькі мове ўсходніх славян. Пераходнае памякчэнне заднеязычных. Змяненне спалучэнняў [**гт**], [**кт**] перад галоснымі [**і**], [**ь**]. Лёс спалучэнняў зычных з наступным [**j**] Змяненне заднеязычных, пярэднеязычных і губных у спалучэнні з [**j**]. Развіццё мяккасці санорных і спалучэння “губны + [**л’**]”. Змяненне спалучэнняў зычных перад [**j**]. Дысіміляцыя ў спалучэннях **дт**, **тт** і звязанае з ёй чаргаванне [**д**] // [**с’**], [**т**] // [**с’**]. Спрашчэнне груп зычных. | 2 | | | | | [1], дап. [3] | |
| | Змяненне спалучэнняў ***ор***, ***ол***, ***ер***, ***ел*** у становішчы паміж зычнымі. Развіццё поўнагалосся. Спалучэнні ***ор***, ***ол*** перад зычным у пачатку слова. Насавыя галосныя, прычыны і фанетычныя ўмовы іх утварэння. Чаргаванні гукаў у беларускай мове, звязаныя з гісторыяй насавых галосных. Страта [**j**] перад [**э**] у пачатку слова, змяненне [**э**] у [**о**] ва ўсходнеславянскіх мовах. | | | | | 2 | | |
| 2.2.2. | Памякчэнне заднеязычных. Змяненне спалучэнняў [**гт**], [**кт**] перад галоснымі [**і**], [**ь**]. Спалучэнні зычных з наступным [**j**] Змяненне заднеязычных, пярэднеязычных і губных у спалучэнні з [**j**]. Развіццё мяккасці санорных і спалучэння “губны + [**л’**]”. Змяненне спалучэнняў зычных перад [**j**]. | | 2 | | | | [1], дап. [3] | Вуснае апытванне пісьмовыя практыкаванні |
| | Дысіміляцыя ў спалучэннях **дт**, **тт.** Спрашчэнне груп зычных. Змяненне спалучэнняў ***ор***, ***ол***, ***ер***, ***ел*** у становішчы паміж зычнымі. Развіццё поўнагалосся. Спалучэнні ***ор***, ***ол*** перад зычным у пачатку слова. | | | | | 2 | | Тэставая работа |
| 2.3. | **Фанетычныя працэсы пісьмовай эпохі (10 г.)** | **4** | **4** | **2** | | **6** | | |
| 2.3.1. | Гісторыя рэдукаваных галосных [**ъ**], [**ь**]. Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у вакалізме. Бегласць галосных. Прыстаўныя галосныя [**і**], [**о** (**а**)] у пачатку слова. Узнікненне ўстаўных галосных перад санорнымі ў новых канцавых спалучэннях зычных. Падаўжэнне галосных [**о**], [**э**] у новых закрытых складах. Спалучэнні рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] з плаўнымі ў становішчы паміж зычнымі. Плаўныя з наступнымі рэдукаванымі. Развіццё чаргаванняў ***ро*** // ***ры***, ***ло*** // ***лы***, ***ле*** // ***лі*** ў беларускай мове. Другое поўнагалоссе. Гісторыя рэдукаваных [**ы**], [**і**].<br>Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у кансанантызме. Другое спрашчэнне груп зычных. Страта канцавога [**л**] у дзеяслоўных формах і назоўніках. Змяненне зычнага [**в**] на [**ў**]. Характар старажытнага [**в**]. Змяненне цвёрдага [**л**] на [**ў**]. Нефанетычны пераход [**л**] у [**ў**]. Зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў. З’явы асіміляцыі ў новых спалучэннях зычных. Поўная і няпоўная, рэгрэсіўная і прагрэсіўная асіміляцыя. Прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх. Прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх. Прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых. Прыпадабненне шыпячых зычных да свісцячых. Зліццё (сцяжэнне) аднолькавых і | 2 | | | | 2 | [1], дап. [3] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | аднатыпных зычных. Прыпадабненне ў спалучэнні ***дн***. Узнікненне падоўжаных зычных. Дысіміляцыя ў новых групах зычных. Змяненне звонкіх зычных на канцы слоў у сувязі з падзеннем рэдукаваных. | | | | | | | |
| 2.3.2. | Фанетычныя змяненні, не абумоўленыя стратаю рэдукаваных. Змяненні галоснага [**ě**] Лёс галоснага [**ě**] ва ўсходнеславянскіх мовах. Змяненне [**э**] на [**о**]. Аканне. Страта канцавога [**і**] у дзеяслоўных формах. Адпадзенне галосных [**у**], [**э**] у канчатках ускосных склонаў назоўнікаў і прыметнікаў Змяненне [**і**] на [**й**] у становішчы пасля галосных. Далейшае памякчэнне зычных [**д’**], [**т’**]. Развіццё прыстаўных зычных [**в**], [**j**], [**г**]. Афрыката [**дж**]. Зычны [**г**]. Зацвярдзенне шыпячых. Змяненні ў вымаўленні зычнага [**ц**]. Страта мяккаэрасц. Паходжанне зычнага [**ф**]. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [3], | |
| 2.3.3. . | Гісторыя рэдукаваных галосных [**ъ**], [**ь**]. Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у вакалізме. Бегласць галосных. Прыстаўныя галосныя [**і**], [**о (а)**] перад санорнымі [**р**], [**л**], [**м**], [**ў**] у пачатку слова. Узнікненне ўстаўных галосных перад санорнымі ў новых канцавых спалучэннях зычных. Другое поўнагалоссе. | | 2 | | | | [1], дап. [3] | Практыкаванні, гістарычны каментарый да слоў |
| 2.3.4. | Вынікі страты рэдукаваных [**ъ**], [**ь**] у кансанантызме беларускай мовы. Другое спрашчэнне груп зычных. Страта канцавога [**л**] у дзеяслоўных формах і назоўніках. Змяненне зычнага [**в**] на [**ў**]. Змяненне цвёрдага [**л**] на [**ў**]. Нефанетычны пераход [**л**] у [**ў**]. Зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў. З’явы асіміляцыі ў новых спалучэннях зычных. Прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх. Прыпадабненне глухіх зычных да звонкіх. Прыпадабненне свісцячых зычных да шыпячых. Прыпадабненне шыпячых зычных да свісцячых. Зліццё (сцяжэнне) аднолькавых і аднатыпных зычных. Прыпадабненне ў спалучэнні ***дн***. Узнікненне падоўжаных зычных. Дысіміляцыя ў новых групах зычных. Змяненне звонкіх зычных на канцы слоў у сувязі з падзеннем рэдукаваных. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [3] | Практыкаванні, гістарычныя каментарыі да слоў |
| 2.3.5. | Фанетычныя змяненні, не абумоўленыя стратаю рэдукаваных. Змяненні галоснага [**ě**] Змяненне [**э**] на [**о**]. Аканне. Страта канцавога [**і**] у дзеяслоўных формах. Зліццё галосных на стыку марфем і ў канчатках прыметнікаў. Змяненне [**і**] на [**й**] у становішчы пасля галосных. Далейшае памякчэнне зычных [**д’**], [**т’**]. Узнікненне дзекання і цекання. Развіццё прыстаўных (пратэтычных) зычных [**в**], [**j**], [**г**]. Зацвярдзенне шыпячых. Змяненні ў вымаўленні зычнага [**ц**]. Страта мяккаэрасці. | | | 2 | | | [1], дап. [3] | Фанетычны каментарый гістарычных форм слова |
| 3. | **ГІСТАРЫЧНАЯ ГРАМАТЫКА (24 г.)** | **12** | **10** | | **2** | **26** | | |
| 3.1. | **Назоўнік (4 г.)** | **2** | **2** | | | **4** | | |
| 3.1.1 | Граматычныя катэгорыі назоўнікаў агульнаўсходнеславянскай мовы. Старажытная сістэма скланення назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ā-***, ***-jā-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ō-***, ***-jō-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ĭ-***. Скланенне | 2 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | назоўнікаў з асновай на ***-ŭ-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на зычныя гукі. Змяненні канчаткаў кожнага тыпу. Утварэнне сучаснай сістэмы скланення назоўнікаў. Паходжанне рознаскланяльных назоўнікаў. Працэс аб’яднання ў множным ліку розных тыпаў скланення старажытнага перыяду. | | | | | | | |
| 3.1.2. | Старажытная сістэма скланення назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ā-***, ***-jā-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ō-***, ***-jō-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ĭ-*** Скланенне назоўнікаў з асновай на ***-ŭ-***. Скланенне назоўнікаў з асновай на зычныя гукі. Змяненні канчаткаў кожнага тыпу скланення ў працэсе фармавання беларускай мовы. Утварэнне сучаснай сістэмы скланення назоўнікаў. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| 3.2. | **Займеннік (4 г.)** | **2** | **2** | | | **4** | | |
| 3.2.1 | Групы займеннікаў паводле адметнасці ў граматычных катэгорыях. Гісторыя скланення асабовых займеннікаў і зваротнага *себе*. Гісторыя скланення неасабовых займеннікаў. Мяккая і цвёрдая разнавіднасць неасабовых займеннікаў. Характар змяненняў у склонавых канчатках займеннікаў мяккай разнавіднасці. Уплыў склонавых канчаткаў мяккай разнавіднасці на склонавыя формы неасабовых займеннікаў цвёрдай разнавіднасці Паходжанне сучаснага скланення займеннікаў 3-й асобы. Скланенне пытальных займеннікаў *къто, чьто*. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |
| 3.2.2. | Групы займеннікаў паводле адметнасці ў граматычных катэгорыях. Гісторыя скланення асабовых займеннікаў і зваротнага *себе*. Гісторыя скланення неасабовых займеннікаў. Мяккая і цвёрдая разнавіднасць неасабовых займеннікаў. Паходжанне сучаснага скланення займеннікаў 3-й асобы. Скланенне займеннікаў *къто, чьто*. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| 3.3 | **Прыметнік (4 г.)** | **2** | **2** | | | **4** | | |
| 3.3.1. | Граматычныя катэгорыі прыметнікаў. Іменныя і займеннікавыя прыметнікі. Гісторыя іменных прыметнікаў, іх скланенне. Утварэнне займеннікавых прыметнікаў. Утварэнне сучасных склонавых формаў займеннікавых прыметнікаў. Фанетычныя змяненні ў канчатках займеннікавых прыметнікаў, іх роля ў фармаванні склонавай парадыгмы поўных прыметнікаў сучаснай беларускай мовы. Выпрацоўка агульных склонавых формаў прыметнікаў мужчынскага, жаночага і ніякага роду ў множным ліку. Прыналежныя прыметнікі ў агульнаўсходнеславянскай мове. Пашырэнне прыналежных прыметнікаў у сучаснай беларускай мове. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Утварэнне вышэйшай ступені параўнання. Іменныя і займеннікавыя формы вышэйшай ступені параўнання. Развіццё найвышэйшай ступені параўнання ў беларускай мове. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |
| 3.3.2. | Іменныя і займеннікавыя прыметнікі. Утварэнне сучасных склонавых формаў займеннікавых прыметнікаў. Фанетычныя змяненні ў канчатках займеннікавых | | 2 | | | 2 | [1], дап. [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | прыметнікаў, іх роля ў фармаванні склонавай парадыгмы поўных прыметнікаў сучаснай беларускай мовы. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. | | | | | | | практыкаванні |
| 3.4. | **Лічэбнік (1 г.)** | ***1*** | | | | **4** | | |
| 3.4.1. | Станаўленне лічэбніка як часціны мовы. Групы колькасных лічэбнікаў у агульнаўсходнеславянскай мове, сістэма іх скланення. Станаўленне сучаснай сістэмы скланення лічэбнікаў у беларускай мове. Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі. Утварэнне складаных лічэбнікаў; суадноснасць іх са словазлучэннямі. Лічэбнікі *сорак* і *дзевяноста*. Фанетычныя змяненні, што адбыліся ў складаных лічэбніках. Дробавыя лічэбнікі (*полтора*, *полтретя*, *полшеста*, *полпятаста*). Зборныя лічэбнікі ў старажытнай беларускай мове. Скланенне парадкавых лічэбнікаў. | 1 | | | | 4 | [1], дап. [4] | |
| 3.5. | **Дзеяслоў. Дзеепрыметнік (6 г.)** | **2** | **4** | | | **6** | | |
| 3.5.1. | Сістэма дзеяслоўных формаў. Асноўныя граматычныя катэгорыі дзеяслова. Сістэма часавых формаў дзеяслова. Простыя і складаныя формы часу. Класы дзеясловаў. Змяненні ў формах дзеясловаў цяперашняга часу. Нетэматычныя і тэматычныя дзеясловы, іх спражэнне. Гісторыя прошлага часу дзеясловаў. Простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквамперфект) формы прошлага часу. Развіццё трыванняў і змяненні ў сістэме прошлых часоў дзеяслова. Формы будучага часу дзеясловаў у агульнаўсходнеславянскай мове. Будучы просты і будучы складаны час, іх значэнне. Утварэнне сучаснага будучага складанага часу. | 1 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |
| 3.5.2. | Умоўны лад. Утварэнне ўмоўнага (умоўна-пажадальнага) ладу. Змены ў дзеясловах умоўнага ладу. Загадны лад. Формы загаднага ладу тэматычных і нетэматычных дзеясловаў у старажытнасці. Утварэнне асабовых формаў, змены ў іх на працягу гісторыі беларускай мовы. Станаўленне сучаснага загаднага ладу. Іменныя формы дзеяслова. Інфінітыў, яго паходжанне і змяненні ў ім. Гісторыя супіна. Паходжанне зваротных дзеясловаў.<br>Сістэма дзеепрыметнікаў. Іменныя і займеннікавыя дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану. Гісторыя дзеепрыслоўяў у беларускай мове. Займеннікавыя формы дзеепрыметнікаў незалежнага стану. Дзеепрыметнікі залежнага стану іменнай і займеннікавай формы, іх лёс у беларускай мове. Дзеепрыметнікі на ***-л-*** у гісторыі беларускай мовы. | 1 | | | | | [1], дап. [4] | |
| 3.5.3. | Змяненні ў формах дзеясловаў цяперашняга часу. Нетэматычныя і тэматычныя дзеясловы, іх спражэнне. Гісторыя прошлага часу дзеясловаў. Простыя (аорыст, імперфект) і складаныя (перфект, плюсквамперфект) формы прошлага часу. Формы будучага часу дзеясловаў у агульнаўсходнеславянскай мове. Будучы просты і будучы | | 2 | | | 4 | [1], дап. [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | складаны час, іх значэнне. Утварэнне сучаснага будучага складанага часу. | | | | | | | |
| 3.5.4 | Умоўны лад. Утварэнне ўмоўнага (умоўна-пажадальнага) ладу. Змены ў дзеясловах умоўнага ладу. Загадны лад. Формы загаднага ладу тэматычных і нетэматычных дзеясловаў у старажытнасці. Станаўленне сучаснага загаднага ладу. | | 2 | | | | [1], дап. [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| | Дзеепрыметнікі ў агульнаўсходнеславянскай мове. Іменныя і займеннікавыя дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану. Гісторыя дзеепрыслоўяў. Формы дзеепрыметнікаў незалежнага стану. Дзеепрыметнікі залежнага стану, іх лёс у беларускай мове. Дзеепрыметнікі на ***-л-*** у гісторыі беларускай мовы. | | | | | | [1], дап. [4] | Гістарычны каментарый тэкста |
| 3.6 | **Прыслоўе (1г.)** | **1** | | | | **2** | | |
| 3.6.1. | Фармаванне прыслоўя як часціны мовы, станаўленне яго граматычных прыкмет. Групы прыслоўяў паводле паходжання і значэння. Прыслоўі займеннікавага паходжання, адыменныя і аддзеяслоўныя. Спосабы ўтварэння прыслоўяў. Развіццё складаных прыслоўяў. | 1 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |
| 3.7. | **Службовыя словы (1 г.)** | **1** | | | | **2** | | |
| 3.7.1. | Прыназоўнікі ў агульнаўсходнеславянскай мове. Простыя і вытворныя прыназоўнікі. Змяненне сінтаксічнай функцыі некаторых прыназоўнікаў у беларускай мове. Развіццё беларускіх варыянтаў прыназоўнікаў (*съ – з*, *отъ – ад*, *въ – у*). Узнікненне на беларускай аснове новых прыназоўнікаў. Марфалагічныя групы злучнікаў агульнаўсходнеславянскай мовы. Спосабы ўтварэння новых злучнікаў. Паходжанне злучнікаў сучаснай беларускай мовы. | 1 | | | | 2 | [1], дап. [4] | |
| 3.8. | **Просты сказ у старажытнабеларускай мове (2г.)** | | | | 2 | | | |
| 3.8.1. | Спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Прэдыкатыўнае ўжыванне дзеепрыметнікаў незалежнага і залежнага стану ў агульнаўсходнеславянскай і старажытнай беларускай мове. Дапасаванне выказніка да дзейніка. Гісторыя канструкцыі “давальны самастойны”. Выражэнне азначэння. Месца членаў простага сказа ў старажытнай беларускай мове. Прамы і адваротны парадак галоўных членаў сказа. Тыпы простых сказаў у гісторыі беларускай мовы. | | | | 2 | | [1], дап. [4] | Складанне канспекта |
| 3.9. | **Складаны сказ (1г.)** | **1** | | | | | | |
| 3.9.1. | Складаназлучаныя сказы. Злучальная, супраціўная, размеркавальная сувязь у злучнікавых сказах. Развіццё сказаў камбінаванай будовы ў беларускай мове. Бяззлучнікавыя сказы. Развіццё сродкаў падпарадкавання і тыпаў даданых сказаў у гісторыі беларускай мовы. Канструкцыі з простай і ўскоснай мовай. | 1 | | | | | [1], дап. [4] | |
| | ***Усяго гадзін у 7 семестры 84*** | **22** | **16** | | **4** | **42** | | **залік** |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4. | **АГУЛЬНАЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XI – XIII СТСТ.) (4г.)** | **2** | **2** | | | **2** | | |
| 4.1. | **Фарміраванне ўсходнеславянскай народнасці. Узнікненне ўсходнеславянскай літаратурнай мовы. (4 г.)** | 2 | 2 | | | **2** | | |
| 4.1.1. | Кніжна-славянская разнавіднасць (тып) і яе адлюстраванне ў творах царкоўнай, апакрыфічнай, прапаведніцкай літаратуры, навуковых і псеўданавуковых творах. Народна-літаратурная разнавіднасць і яе адлюстраванне ў жанрах арыгінальнай мастацкай літаратуры, летапісах, павучэннях. Погляды вучоных адносна паходжання “Слова аб палку Ігаравым”. Дзелавая мова XI-XIII стст., прычыны яе ўзнікнення, блізкасць да гутарковай мовы. Спецыфічныя формулы і звароты дзелавога пісьменства. Важнейшыя структурныя адрозненні старaславянской (царкоўнаславянскай) і ўсходнеславянскай моў. Роля стараславянскай (царкоўнаславянскай) мовы ў фарміраванні ўсходнеславянскай літаратурнай мовы. Пісьмовая культура на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XI – XIII стст. Распаўсюджанасць пісьменства сярод насельніцтва. Помнікі матэрыяльнай культуры і прыкладнога мастацтва з надпісамі. Дзейнасць Е.Полацкай, К.Тураўскага, А.Смаленскага. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| 4.1.2. | Дзелавая мова XI-XIII стст., прычыны яе ўзнікнення, блізкасць да гутарковай мовы. Спецыфічныя формулы і звароты дзелавога пісьменства. Важнейшыя структурныя адрозненні старaславянской (царкоўнаславянскай) і ўсходнеславянскай моў. Пісьмовая культура на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XI – XIII стст. Дзейнасць Е.Полацкай, К.Тураўскага, А.Смаленскага. | | 2 | | | | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 5. | **СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XIV – XVIII СТСТ.). (18 г.)** | **8** | **10** | | | **20** | | |
| 5.1. | **Фарміраванне беларускай народнасці і яе мовы. (1 г.)** | ***1*** | | | | **4** | | |
| 5.1.1 | Гістарычныя прычыны ўзнікнення беларускай народнасці, фарміраванне яе мовы на аснове мясцовых тэрытарыяльных дыялектаў. Розныя погляды вучоных на паходжанне беларускай мовы. Мова беларускіх помнікаў XIV ст. Беларускія асаблівасці ў ранніх помніках. Збліжэнне літаратурна-пісьмовай мовы з жывой народнай гаворкай. Графічныя і арфаграфічныя асаблівасці мовы помнікаў XIV ст. Функцыі старабеларускай літаратурнай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Замацаванне Статутам ВКЛ беларускай мовы ў якасці афіцыйнай. Беларуская мова – мова дзяржаўных дакументаў, судовага справаводства. Стылістычныя разнавіднасці старабеларускай літаратурнай мовы. | 1 | | | | 4 | [1], дап. [1] | |
| 5.2. | **Мова дзелавых помнікаў XIV – XVII стст. (граматы, статуты, судовыя дакументы). (3 г.)** | **1** | **2** | | | **4** | | |
| 5.2.1 | “Метрыка ВКЛ”, “Статут ВКЛ”. Адлюстраванне ў дзелавых помніках асаблівасцей | 1 | | | | 2 | [1], дап. | Рэйтынгавая |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | жывой народнай мовы (багацце лексікі, беларускія фанетычныя і граматычныя рысы). Традыцыйныя сродкі і прыёмы дзелавога пісьменства. | | | | | | [1] | кантрольная работа |
| 5.2.2. | "Метрыка ВКЛ", "Статут ВКЛ". Адлюстраванне ў дзелавых помніках асаблівасцей жывой народнай мовы (багацце лексікі, беларускія фанетычныя і граматычныя рысы). Традыцыйныя сродкі і прыёмы дзелавога пісьменства. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні |
| 5.3 | **Мова беларускіх летапісаў (2 г.)** | | **2** | | | **2** | | |
| 5.3.1. | Своеасаблівасць сродкаў і прыёмаў летапісання. Мова летапісаў кароткай рэдакцыі. Мова летапісаў поўнай рэдакцыі. Традыцыі агульнаўсходнеславянскага летапісання і выпрацоўка ўласнабеларускіх прыёмаў пісьма. "Баркулабаўскі летапіс". | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, пераклад тэксту |
| 5.4. | **Мова мастацкіх твораў XV – XVIII стст. (2 г.)** | | **2** | | | **2** | | |
| 5.4.1. | Перакладная мастацкая літаратура (рыцарскія раманы, гістарычныя аповесці). Арыгінальная мастацкая літаратура XVI – XVII стст. (вершы А.Рымшы, "Прамова Мялешкі", "Ліст да Абуховіча"). Выкарыстанне ў гэтых творах элементаў вуснай народнай мовы. Моўнае майстэрства старажытных пісьменнікаў. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, гістарычныя каментарыі стара-жытных тэкстаў, пе-раклад тэксту |
| 5.5. | **Мова рэлігійных твораў XV – XVIII стст. (2 г.)** | **2** | | | | **2** | | |
| 5.5.1. | Пранікненне жывых моўных асаблівасцей у раннія рэлігійныя творы. Асаблівасці мовы бытавых рэлігійных твораў, блізкасць іх да жывой мовы ("Страсці Хрыстовы", "Аповесць пра трох каралёў-вешчуноў"). Пераклады тэкстаў святога пісання і апакрыфічнай літаратуры з арабскай мовы на беларускую (кітабы). | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| 5.6. | **Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. (4 г.)** | **2** | **2** | | | **4** | | |
| 5.6.1. | Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны ў Празе і Вільні. Графічныя асаблівасці выданняў Ф.Скарыны. Прадмовы і пасляслоўі Ф.Скарыны, іх змест, накіраванасць. Мова выданняў Скарыны.<br>Пераклад кананічнай літаратуры на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатаку XVII стст. Дзейнасць С.Буднага, І.Фёдарава, П.Мсціслаўца, братоў Мамонічаў. Скарынінскія традыцыі ў выдавецкай дзейнасці паслядоўнікаў першадрукара. Роля кнігадрукавання ў развіцці літаратурнай мовы і беларускай культуры.<br>Лёс царкоўнаславянскай мовы на Беларусі ў XIV – XVIII стст., сферы яе выкарыстання. Заняпад праваслаўя на беларускіх і ўкраінскіх землях і крызіс царкоўнаславянскай мовы. Часовы ўздым царкоўнаславянскай культуры і мовы з канца XVI ст., звязаны з барацьбой праваслаўя супраць каталіцызму і уніяцтва. Роля царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.<br>Мова навуковых і палемічных твораў XVI – XVII стст. Значэнне прадмоў Ф.Скарыны | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | Рэйтынгавая кантрольная работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ў станаўленні навуковага стылю. Прычыны ўзнікнення палемічных твораў, іх сацыяльная завостранасць, асаблівасці мовы. | | | | | | | |
| 5.6.2. | Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны Графічныя асаблівасці выданняў Ф.Скарыны. Прадмовы і пасляслоўі Ф.Скарыны, іх змест, накіраванасць. Мова выданняў Скарыны. Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатаку XVII стст. Дзейнасць С.Буднага, І.Фёдарава, П.Мсціслаўца, братоў Мамонічаў. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 5.7 | **Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў XVI – XVII стст. (4 г.)** | **2** | **2** | | | **2** | | |
| 5.7.1. | Буквары і граматыкі І.Фёдарава, Л.Зізанія, М.Сматрыцкага і іх роля ў акрэсліванні норм літаратурнай мовы і ў пазнейшай граматычнай распрацоўцы ўсходнеславянскіх моў. “Граматыка” І.Ужэвіча. Лексікаграфічныя працы XVI – XVII стст. (“Лексіс” Л.Зізанія, “Лексікон” П.Бярынды). Роля граматык і слоўнікаў у развіцці старажытнай беларускай літаратурнай мовы. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| 5.7.2. | Умовы развіцця беларускага пісьменства з канца XVI ст. Ужыванне на Беларусі лацінскай мовы. Паэт-лацініст Мікола Гусоўскі – слаўны дзеяч беларускай культуры. Спроба падмяніць беларускае пісьменства польскім. Дзейнасць брацтваў, брацкія школы. Забарона сеймам Рэчы Паспалітай (1696 г.) ужываць беларускую мову ў афіцыйным справаводстве. Заняпад беларускага пісьменства. Беларуская мова ў пісьмовых помніках XVIII стст. Беларускія інтэрмедыі. Характар выкарыстання ў гэтых творах жывой гаворкі беларускага народа. Беларускія тэксты ў камедыі К.Марашэўскага (1787). | | 2 | | | | [1], дап. [1], [2] | |
| 6. | **НОВАЯ (СУЧАСНАЯ) БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ МОВА (XIX-XX СТСТ.) (20 г.)** | **10** | **6** | **2** | **2** | **20** | | |
| 6.1. | **Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы ў XIX ст. (4 г.)** | | ***2*** | ***2*** | | **4** | | |
| 6.1.1. | Мастацкая літаратура як галоўная сфера фарміравання і развіцця новай (сучаснай) беларускай літаратурнай мовы. Мова ананімных твораў першай паловы XIX ст.<br>Роля В.Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Погляд яго на беларускую мову і ролю пісьменніка. Асветніцкая дзейнасць В.Дуніна-Марцінкевіча. Мова ранніх твораў, адбітак на ёй сентыменталізму. Мова камедыі “Пінская шляхта” як вышэйшая ступень моватворчасці пісьменніка. Роля Ф.Багушэвіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Погляды пісьменніка на беларускую мову. Развіццё ім беларускай літаратурнай мовы на аснове жывой народнай мовы і вуснай народнай творчасці. Характэрныя асаблівасці стылю пісьменніка. Барацьба Ф.Багушэвіча за чысціню літаратурнай мовы. | | | 2 | | 2 | [1], дап. [1], [2] | Гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 6.1.2. | Мастацкая літаратура як галоўная сфера фарміравання і развіцця новай (сучаснай) беларускай літаратурнай мовы. Мова ананімных твораў першай паловы XIX ст. (вершы, гутаркі, паэмы “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”), яе сувязь з жывой народнай мовай, вусна-паэтычнай творчасцю народа. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 6.2. | **Публіцыстыка на беларускай мове ў другой палове XIX ст. (4 г.)** | **2** | **2** | | | **2** | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6.2.1. | Элементы публіцыстычнага стылю ў ананімных гутарках. “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага – першая беларуская газета. Спалучэнне ў газеце сродкаў і прыёмаў размоўна-бытавога і газетна-публіцыстычнага стыляў. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| 6.2.2. | Элементы публіцыстычнага стылю ў ананімных гутарках. “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага – першая беларуская газета. Спалучэнне ў газеце сродкаў і прыёмаў размоўна-бытавога і газетна-публіцыстычнага стыляў. | | 2 | | | | [1], дап. [1], [2] | Апытванне, гістарычныя каментарыі старажытных тэкстаў |
| 6.3. | **Беларуская літаратурная мова ў пачатку XX ст. (4 г.)** | **2** | | | **2** | **4** | | |
| 6.3.1. | Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. і ўздым нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі. Дзейнасць выдавецтваў “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша ніва”, “Наша хата” і інш. Першыя легальныя беларускія газеты “Наша доля” (1906) і “Наша ніва” (1906 – 1915), іх роля ў развіцці беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Правапісныя і граматычныя асаблівасці выданняў пачатку XX ст. Графічныя асаблівасці беларускіх выданняў гэтага часу: кірыліца (“грамадзянка”), лацінка. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| 6.3.2. | Дзейнасць выдавецтваў “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша ніва”, “Наша хата” і інш. Першыя легальныя беларускія газеты “Наша доля” (1906) і “Наша ніва” (1906 – 1915), іх роля ў развіцці беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Правапісныя і граматычныя асаблівасці выданняў пачатку XX ст. Графічныя асаблівасці беларускіх выданняў гэтага часу: кірыліца (“грамадзянка”), лацінка. | | | | 2 | 2 | [1], дап. [1] | Рэфераты, даклады |
| 6.4 | **Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў першае дзесяцігоддзе пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г.(2 г.)** | **2** | | | | **4** | | |
| 6.4.1. | Змены, якія адбыліся ў грамадскім і культурным жыцці беларускага народа. Ужыванне беларускай літаратурнай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Беларусізацыя. Роля дыялектаў у фарміраванні сучаснай літаратурнай мовы. Беларуская дыялектная мова – аснова літаратурнай мовы. Узаемадзеянне літаратурнай мовы і народных гаворак. | 2 | | | | 4 | [1], дап. [1] | |
| 6.5. | **Распрацоўка граматычных пытанняў беларускай мовы ў 20-30 гг. XX ст. (2 г.)** | | **2** | | | **2** | | |
| 6.5.1 | Правапіс Б.Тарашкевіча, яго значэнне ў школьным навучанні і выдавецкай практыцы. Выпрацоўка лінгвістычнай тэрміналогіі, распрацоўка пытанняў граматыкі ў падручніку. | | 2 | | | 2 | [1], дап. [1], [2] | |
| 6.6. | **Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30-я гады XX ст.(2 г.)** | **2** | | | | **2** | | |
| 6.6.1. | Першыя двухмоўныя слоўнікі братоў Гарэцкіх, М.Гарэцкага. Дзейнасць Слоўнікавай камісіі. Слоўнікі М.Байкова і С.Некрашэвіча, М.Байкова і М.Гарэцкага, В.Ластоўскага. Выпрацоўка беларускай тэрміналогіі ў 20-30 гады. Дзейнасць Тэрміналагічнай камісіі. Акадэмічная канферэнцыя 1926 г.; рэформа правапісу 1933 г., змены правапісу 1957 г. Кадыфікацыя граматычных нормаў і стварэнне адзінага | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | Рэйтынгавая кантрольная работа |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | дзяржаўнага правапісу. Замацаванне адзінай графічнай сістэмы і арфаэпічных нормаў. | | | | | | | |
| 6.7. | **Асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы ў другой палове ХХ ст. – пачатку ХХ ст. (2 г.)** | **2** | | | | **2** | | |
| 6.7.1. | Звужэнне сфер выкарыстання беларускай мовы ў 50-80 гг. Моўная сітуацыя ў Беларусі ў 80-90 гг. Перспектывы развіцця беларускай літаратурнай мовы ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі; прызнанне беларускай мовы як дзяржаўнай. Закон "Аб мовах у Беларускай ССР" (1990); дзяржаўная праграма рэалізацыі закона. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў сучасных умовах. | 2 | | | | 2 | [1], дап. [1] | |
| | ***Усяго гадзін у 8 семестры 84*** | **20** | **18** | | **4** | **42** | | **экзамен** |
| | **Усяго: 168 гадзін** | **42** | **34** | | **8** | **84** | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гісторыя беларускай мовы [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс / склад.: Д. В Дзятко, М. С. Ржавуцкая / Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/30900. – Дата доступу: 06.04.2021.

**Дадатковая літаратура**

1. Леванцэвіч, Л. В. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : вучэб. дапам. / Л. В. Леванцэвіч. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2020. – 192 с.
2. Леванцэвіч, Л. В. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : практыкум для студэнтаў філал. фак. / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 2019. – 73 с.
3. Свістунова, М. І. Гістарычная фанетыка беларускай мовы : вучэб. дапам. / М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2016. – 317 с.
4. Янкоўскі, Ф. М. Гісторыя беларускай мовы: гістарычная граматыка : вучэб. дапам. / Ф. М. Янкоўскі ; навук. рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК РОЗНАЎЗРОЎНЕВЫХ ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

## *Гістарычная фанетыка і гістарычная граматыка беларускай мовы*

### *Кіруемая самастойная праца № 1*

### 2.3.5. Фанетычныя змяненні, не абумоўленыя стратаю рэдукаваных

**Узровень 1.** *Дайце азначэнне тэрмінам:* аканне, дзеканне, цеканне, пратэтычны зычны, мяккаэрасць.

**Узровень 2.** *Вызначце пазіцыю рэдукаваных* **ъ, ь** *ў словах (+ моцная, – слабая) і растлумачце яе.*

**Ѡбьдъ, кънига, гъртань, локъть.**

*Ахарактарызуйце зычныя гукі ў словах паводле наяўнасці – адсутнасці палаталізацыі.*

**Квѣтъ, обозъ, племѧ.**

**Узровень 3.** *Праілюструйце, як утварыліся ўсходнеславянскія поўнагалосныя формы ў словах і параўнайце іх з адпаведнымі старaславянскімі.*

**Беремѧ, молодъ, соромъ.**

*Растлумачце паходжанне выдзеленых зычных гукаў у словах, аднавіўшы іх першасныя варыянты.*

**Свечу, з вълцъхъ, сѣчи, кожух, класть.**

### *Кіруемая самастойная праца №2*

### 3.8.1. Просты сказ у старажытнай беларускай мове

**Узровень 1.** *Складзіце простыя сказы са словамі, вызначце пазіцыю рэдукаваных* **ъ, ь** *у словах (+ моцная, – слабая) і растлумачце яе.*

**Ледъ, ръпътъ, гънати, вълна.**

**Узровень 2.** *Складзіце простыя сказы са словамі, ахарактарызуйце зычныя гукі ў словах паводле наяўнасці – адсутнасці палаталізацыі.*

**Стрѣха, цѣна, вихрь.**

**Узровень 3.** *Складзіце простыя сказы са словамі, праілюструйце, як утварыліся ўсходнеславянскія поўнагалосныя формы ў словах і параўнайце іх з адпаведнымі старaславянскімі.*

**Ворота, порохъ, солодъ.**

*Растлумачце паходжанне выдзеленых зычных гукаў у словах, аднавіўшы іх першасныя варыянты.*

**Пишчу, страшьнъ, мочи, межа, мести.**

***Кіруемая самастойная праца № 3***

**6.1.1. Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы ў 19 ст.**

**Узровень 1.** *Ахарактарызуйце мову ананімных твораў першай паловы 19 ст.*

**Узровень 2.** *Ахарактарызуйце мову камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”.*

*Вызначце пазіцыю рэдукаваных* **ъ, ь** *ў словах (+ моцная, – слабая) і растлумачце яе.*

**Къто, бьрьвьно, мъного, вълче.**

*Ахарактарызуйце зычныя гукі ў словах паводле наяўнасці – адсутнасці палаталізацыі.*

**Ликъ, страхъ, голѹбь.**

**Узровень 3.** *Ахарактарызуйце мову твораў Ф. Багушэвіча. Праілюструйце, як утварыліся ўсходнеславянскія поўнагалосныя формы ў словах і параўнайце іх з адпаведнымі старaславянскімі.*

**Долонь, сторона, молодъ.**

*Растлумачце паходжанне выдзеленых зычных гукаў у словах, аднавіўшы іх першасныя варыянты.*

**Вырошчѹ, на лице, стричи, кѹпля, клести.**

***Кіруемая самастойная праца №4***

**6.3.2. Дзейнасць выдавецтваў**

**Узровень 1.** *Ахарактарызуйце дзейнасць выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”.*

**Узровень 2.** *Ахарактарызуйце ролю газет “Наша доля” і “Наша ніва” ў развіцці беларускай мовы. Зрабіце гістарычны (фанетычны і марфалагічны) каментарый слоў:*

**Берегти, сыновъ,голѹбь, берьгъ**

**Узровень 3.** *Ахарактарызуйце графічныя асаблівасці беларускіх выданняў. Зрабіце гістарычны (фанетычны і марфалагічны) каментарый слоў:*

**Садйа, правьда, клекотати, съметана**

**Пекти, греблъ, дъхорь, вълкъ**

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная праца студэнтаў прадугледжвае грунтоўнае вывучэнне даведачнай літаратуры па гістарычнай граматыцы і гісторыі беларускай літаратурнай мовы, а таксама гістарычных слоўнікаў, у якіх адлюстравана не толькі семантыка старажытных лексічных адзінак, але і іх этымалогія. Слоўнікі прыдатныя і ў тых выпадках, калі неабходна зрабіць пэўны від перакладу (мастацкі, афіцыйна-справавы, навуковы і інш.) са старажытнай беларускай мовы рознага перыяду і пэўнага функцыянальнага стылю на сучасную беларускую літаратурную мову.

Пры вывучэнні фанетычных працэсаў дапісьмовай і пісьмовай эпохі старажытнай беларускай мовы мэтазгодна праводзіць гістарычны аналіз моўных фактаў на розных помніках славянскага пісьменства, а таксама супастаўляць гэтыя факты з фактамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Вывучэнне “Гістарычнай марфалогіі”, у прыватнасці такіх самастойных часцін мовы, як назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, варта звяртацца не толькі да аналізу разнастайных лексічных адзінак на марфалагічным ўзроўні, але і на фанетычным. Такі падыход дазволіць актывізаваць вучэбную дзейнасць студэнтаў, а таксама будзе спрыяць замацаванню раней вывучанага матэрыялу.

Пры вывучэнні гісторыі беларускай літаратурнай мовы неабходна выкарыстоўваць хрэстаматыйныя тэксты розных дапаможнікаў, у тым ліку і электронных, каб выпрацоўваць у студэнтаў навыкі адбору, сістэматызацыі і кваліфікацыі разнастайных моўных гістарычных фактаў, уменні гістарычнага аналізу тэкставых ўрыўкаў рознага часу, а таксама навыкі каменціравання моўных асаблівасцяў старажытных беларускіх пісьмовых помнікаў.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № н/п | Назва тэмы, раздзела | Кол-сць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Гісторыя беларуская мовы як раздзел мовазнаўства і вучэбная дысцыпліна | 2 | Карыстаючыся энцыклапедыяй “Беларуская мова” (Мінск, 1994), зрабіць канспект артыкула “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы” [с.147-156] | Канспект |
| 2. | Гукавая сістэма агульнаўсходнеславянскай мовы дапісьмовай эпохі | 4 | Даць характарыстыку галосным паводле ўтварэння (2, № 1, с.14) і характарыстыку зычным паводле месца і спосабу ўтварэння [2, № 15, с.21] | Пісьмовае практыкаванне |
| 3. | Фанетычныя працэсы дапісьмовай эпохі, | | Выявіць суадносіны няпоўнагалосных і поўнагалосных форм [2, № 30, с.28- | Пісьмовая работа |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | адлюстраванне іх вынікаў у беларускай мове | 4 | 29], паказаць заканамернасці палаталізацыі заднеязычных у беларускай мове [2, № 42, с.34] | |
| 4. | Фанетычныя працэсы пісьмовай эпохі | 4 | Устанавіць пазіцыю рэдукаваных ы, и [2, № 50, с.38] | Аналіз фанетычнай пазіцыі |
| 5. | Вынікі страты рэдукаваных [ь], [ ъ ] у кансанантызме беларускай мовы | 2 | Растлумачыць прычыны гукавага змянення беларускіх і рускіх адпаведнікаў [2, № 62, с.41] | Параўнанне беларускіх і рускіх адпаведнікаў |
| 6. | Назоўнік. Старажытная сістэма скланення назоўнікаў | 4 | Выканаць поўны граматычны разбор назоўнікаў па ўзоры [2, № 44, с.102] | Граматычны разбор |
| 7. | Займеннік. Групы займеннікаў паводле адметнасці ў граматычных катэгорыях | 4 | Прааналізаваць займеннікі як часціну мовы [2, № 10, с.106] | Марфалагічны аналіз |
| 8. | Прыметнік. Іменныя і займеннікавыя прыметнікі | 4 | Паказаць асаблівасці ўтварэння вышэйшай ступені параўнання прыметніка ў сучасных ўсходнеславянскіх мовах | Параўнанне формаў прыметніка |
| 9. | Лічэбнік. Станаўленне лічэбніка як часціны мовы | 4 | Запоўніць табліцу, указаць разрад лічэбніка па значэнні, склад, склон і інш. [2, № 14, с.119] | Праца з табліцай |
| 10. | Дзеяслоў. Сістэма дзеяслоўных формаў | 2 | Даць гістарычнае тлумачэнне дзеяслоўным формам [2, № 3, с.120] | Гістарычны аналіз |
| 11. | Змяненне ў формах дзеясловаў цяперашняга часу. Гісторыя прошлага часу дзеясловаў | 4 | Выпісаць дзеясловы і зрабіць іх марфалагічны разбор [2, № 38, с.133] | Марфалагічны разбор |
| 12. | Прыслоўе | 2 | Растлумачыць паходжанне і марфемны склад прыслоўяў [2, № 4, с.135-136] | Этымалагічны аналіз |
| 13. | Службовыя словы | 2 | Даць тлумачэнне паходжання службовых слоў [2, № 3, с.144] | Этымалагічны аналіз |
| 14. | Фарміраванне ўсходнеславянскай народнасці. Узнікненне ўсходнеславянскай літаратурнай мовы | 4 | Адзначыць усходнеславянскія і стараславянскія моўныя асаблівасці ва ўрыўку “Слова пра паход Ігаравы” [2, с.74] | Аналіз моўных асаблівасцей тэксту |
| 15. | Фарміраванне беларускай народнасці і яе мовы | 4 | Зрабіць каментарый старажытнага тэксту “Надпіс на крыжы Еўфрасінні Полацкай” [7, с.248] | Гістарычны каментарый тэксту |
| 16. | Мова дзелавых помнікаў 14-17 стст. (граматы, статуты, судовыя дакументы) | 4 | Паказаць ў тэксце Статута ВКЛ фанетычныя і граматычныя асаблівасці беларускай мовы [7, с.270] | Фанетычны і граматычны аналіз тэксту |
| 17. | Мова беларускіх летапісаў | 2 | Перакласці ўрывак з Баркулабаўскага летапісу на сучасную беларускую | Пераклад тэксту |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | літаратурную мову [2, с.153-154] | |
| 18. | Мова мастацкіх твораў 15-18 стст. | 2 | Выявіць фанетычныя і граматычныя асаблівасці тагачаснай беларускай мовы ва ўрыўку “Прамовы Мялешкі” | Аналіз тэксту на фанетычным і граматычным узроўні |
| 19. | Мова рэлігійных твораў 15-18 стст. | 2 | Зрабіць лексічны аналіз беларускіх перакладаў канфесійных тэкстаў (“Евангелле” В.Цяпінскага, “Катэхізіс” С.Буднага) [2, с.87] | Лексічны аналіз тэксту |
| 20. | Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове 16-пачатку 17 стст. | 4 | Перакласці тэкст з Бібліі Ф.Скарыны, выявіць спецыфічныя асаблівасці старажытнай беларускай мовы [2, с.14-15] | Пераклад і аналіз тэксту |
| 21. | Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў 16-17 стст. | 2 | Падрыхтаваць паведамленне пра лінгвістычныя працы Л.Зізанія, М. Сматрыцкага і інш. | Пісьмовае паведамленне |
| 22. | Станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы ў 19 ст. | 2 | Даць характарыстыку мовы твораў першай паловы 19 ст. (“Энеіда навыварат”, “Тарас на Парнасе” і інш.) | Характарыстыка моўных асаблівасцей твора |
| 23. | Публіцыстыка на беларускай мове ў другой палове 19 ст. | 2 | Прааналізаваць моўныя асаблівасці газеты “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага | Аналіз моўных асаблівасцей |
| 24. | Беларуская літаратурная мова ў пачатку 20 ст. | 4 | Карыстаючыся энцыклапедыяй “Беларуская мова (Мінск, 1994), заканспектаваць артыкул “Наша ніва” [с.384-386] | Канспект артыкула |
| 25. | Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў першае дзесяцігоддзе пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. | 4 | Падрыхтаваць даклад “Новыя ўмовы развіцця беларускай літаратурнай мовы пасля 1917 года” | Даклад |
| 26. | Распрацоўка граматычных пытанняў беларускай мовы ў 20-30 гады 20 ст. | 2 | Прааналізаваць “Беларускую граматыку для школ” Б.Тарашкевіча з боку тэрміналогіі | Лінгвістычны аналіз працы |
| 27. | Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30 гады 20 ст. | 2 | Падрыхтаваць паведамленне “Тэрміналагічныя камісіі” [Энцыклапедыя “Беларуская мова”, с.568] | Вуснае паведамленне |
| 28. | Асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы ў другой палове 20 ст. – пачатку 21 ст. | 2 | Зрабіць аналіз палажэнняў і артыкулаў “Закона аб мовах у Беларускай ССР” | Аналіз палажэння ў і артыкулаў |

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДЛЯ РЭЙТЫНГАВАЙ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 1 ПА ТЭМЕ “Мова дзелавых помнікаў 14-16 стст.”

Заданні

1. Ахарактарызуйце помнік (на выбар): “Метрыка ВКЛ”, “Статут ВКЛ”.
2. Перакладзіце тэкст на сучасную беларускую літаратурную мову(Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы: вучэб. дапам. Ч.1. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1961. – С.220-221).
3. Прааналізуйце тэкст на фанетычным і граматычным узроўні.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДЛЯ РЭЙТЫНГАВАЙ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 2 ПА ТЭМЕ “Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове16 – пачатку 17 стст.”

Заданні

1. Ахарактарызуйце мову выданняў Скарыны.
2. Перакладзіце тэкст на сучасную беларускую літаратурную мову: “Біблія” Францыска Скарыны (Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы: вучэб. дапам. Ч.2. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1962. – С.106-107 (17 радкоў)).
3. Прааналізуйце тэкст на лексічным, фанетычным і граматычным узроўні.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДЛЯ РЭЙТЫНГАВАЙ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ № 3 ПА ТЭМЕ “Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30г.г. 20 ст.”

Заданні

1. Ахарактарызуйце дзейнасць Тэрміналагічнай камісіі.
2. Запішыце тэрміны з дапаможніка: Тарашкевіч, Б.А. Беларуская граматыка для школ / Б.А. Тарашкевіч. – Факсімільнае выданне. – Мінск: Народная асвета,1991. – 136.
3. Параўнайце лінгвістычныя тэрміны сучаснай беларускай літаратурнай мовы і тэрміны з “Беларускай граматыкі для школ” Б.Тарашкевіча. Выявіце агульнае і адрознае.

# АПІСАННЕ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на выніковым этапе (экзамене) выкарыстоўваюцца:

1. Тэсты і тэставыя заданні пры вывучэнні раздзелаў, звязаных з гістарычнай фанетыкай і гістарычнай марфалогіяй.
2. Рознаўзроўневыя лінгвістычныя заданні па гістарычным каментарыі (фанетычным і марфалагічным) старажытных лексічных адзінак.
3. Пераклад старажытных тэкстаў розных стыляў на сучасную беларускую літаратурную мову.
4. Падбор матэрыялаў і падрыхтоўка паведамленняў па тэмах гісторыі беларускай літаратурнай мовы.
5. Напісанне рэфератаў, прысвечаных славутым беларускім пісьмовым помнікам.
6. Вусныя выказванні, прысвечаныя вядомым даследчыкам гісторыі беларускай літаратурнай мовы.
7. Канспектаванне найбольш дыскусійных пытанняў гісторыі мовы (матэрыялы манаграфій сучасных айчынных і замежных даследчыкаў мовы).
8. Каментарый моўных асаблівасцей старажытных помнікаў пісьменства.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВЫВУЧЭННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Тэматыка і планы аўдыторнай работы студэнтаў па вывучаным матэрыяле (планы паслядоўнага правядзення заняткаў) па наступнай схеме:

тэма;

план;

пытанні для калектыўнага абмеркавання;

заданні для самастойнай працы;

літаратура (асноўная, дадатковая).

*Патрабаванні да вынікаў засваення дысцыпліны*

Студэнт, які пачынае вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы”, абавязаны засвоіць матэрыял з сучаснай беларускай мовы, гісторыі мовы, тэорыі мовы.

Працэс вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай мовы” накіраваны на фарміраванне наступных кампетэнцый:

*Агульнакультурныя кампетэнцыі:*

- здольнасць ажыццяўляць і развіваць свой інтэлектуальны і агульнакультурны ўзровень;
- здольнасць самастойнага навучання новым метадам даследавання, змянення навуковага і навукова-вытворчага профіля сваёй прафесійнай дзейнасці;
- здольнасць самастойна набываць пры дапамозе інфармацыйных тэхналогій і выкарыстоўваць у працэсе практычнай дзейнасці новыя веды і ўменні, у тым ліку ў новых галінах ведаў, непасрэдна не звязаных са сферай дзейнасці;
- здольнасць спараджаць новыя ідэі, адаптоўвацца да новых сітуацый, пераацэньваць накоплены вопыт, аналізаваць свае магчымасці.

*Прафесійныя кампетэнцыі ў навукова-даследчыцкай дзейнасці:*

- здольнасць дэманстраваць веды сучаснай навуковай парадыгмы ў галіне філалогіі і дынамікі яе развіцця, сістэмы метадалагічных прынцыпаў і метадалагічных прыёмаў філалагічнага даследавання;
- здольнасць да самастойнага папаўнення, крытычнага аналізу і прымянення тэарэтычных і практычных ведаў у сферы філалогіі і іншых гуманітарных навук для ўласных навуковых даследаванняў.

# БЯГУЧАЯ АТЭСТАЦЫЯ

Бягучая атэстацыя носіць накапляльны характар, і пры паспяховым выкананні бягучай самастойнай працы студэнт набывае магчымасць атрымання аўтаматычнай атэстацыі ў канцы семестра. Такая форма арганізацыі і правядзення атэстацыі дазваляе матываваць студэнта да сістэмнай, планамернай працы напрацягу семестра.

У ходзе атэстацыі ацэньваюцца вынікі засваення дысцыпліны, якія праяўляюцца:

- ва ўменні дакладна вызначаць асноўныя граматычныя і фанетычныя рысы беларускай мовы розных гістарычных перыядаў;
- ва ўменні працаваць са старажытнымі тэкстамі;
- ва ўменні ілюстраваць тэарэтычныя палажэнні моўнымі фактамі.

Акрамя таго, у ходзе атэстацыі ацэньваюцца вынікі вывучэння вучэбнай дысцыпліны, для чаго выкарыстоўваюцца:

1. Тэсты з мэтай праверкі ведаў па асноўных пытаннях курса.
2. Абмеркаванне плана, хода і вынікаў выканання заданняў для самастойнай працы.
3. Аналіз распрацаваных схем заняткаў і арганізацыі самастойнай працы з улікам асноўных тэндэнцый развіцця моўнай адукацыі на сучасным этапе.
4. Ацэньванне паўнаты і адэкватнасці напаўнення банка інфармацыйных рэсурсаў па тэматыцы КСР.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

1. Гісторыя беларускай мовы як раздзел мовазнаўства і вучэбная дысцыпліна, прадмет і задачы курса. Месца курса ў сістэме іншых раздзелаў навукі аб беларускай мове.
2. Крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы.
3. Перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы.
4. Сістэма галосных агульнаўсходнеславянскай мовы.
5. Сістэма зычных агульнаўсходнеславянскай мовы.
6. Першая палаталізацыя, узнікненне чаргаванняў заднеязычных з шыпячымі.
7. Другая і трэцяя палаталізацыі, узнікненне чаргаванняў заднеязычных са свісцячымі.
8. Змяненне спалучэнняў гт, кт, (*gt, *kt) перад галоснымі ь, і.
9. Лёс спалучэнняў зычных з наступным й (j).
10. Развіццё мяккіх санорных і спалучэння “губны + [л’].
11. Дыярэза (спрашчэнне) у спалучэннях зычных.
12. Дысіміляцыя ў спалучэннях *дт, *тт.
13. Поўнагалоссе.
14. Гісторыя рэдукаваных галосных ъ, ь.
15. Вынікі страты рэдукаваных у вакалізме. Бегласць галосных.
16. Пыстаўныя галосныя.
17. Устаўныя галосныя.
18. Развіццё чаргаванняў ро- ры, ло- лы, ле- лі
19. Змяненне в на ў. Змяненне цвёрдага л на ў.
20. Зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў.
21. З’явы асіміляцыі ў новых спалучэннях зычных (прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх, глухіх зычных да звонкіх, звонкіх да глухіх, шыпячых да свісцячых, свісцячых да шыпячых).
22. Узнікненне падоўжаных зычных.
23. Змяненне галоснага Ѣ (яць).
24. Змяненне галоснага э на о. Адсутнасць змянення э на о ў асобных словах.
25. Развіццё прыстаўных зычных в, й, г.
26. Зацвярдзенне шыпячых і зычнага р. Змяненне ў вымаўленні зычнага ц.
27. Узнікненне дзекання і цекання.
28. Аканне ў беларускай мове.
29. Страта канцавога і.

# ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ"

1. Асаблівасці развіцця беларускай літаратурнай мовы ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст.
2. Асаблівасці функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў 20-я гг. XX ст.
3. Асаблівасці функцыянавання беларускай літаратурнай мовы ў другой палавіне XIX ст.
4. Беларускае кнігадрукаванне і развіццё беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XX ст.
5. Беларуская мова ў пісьмовых помніках XVIII стст. Беларускія інтэрмедыі і камедыі.
6. Беларуская мова ў пісьмовых помніках XVIII стст. Паэт-лаціністМіколаГусоўскі – слаўны дзеяч беларускай культуры.
7. Выпрацоўка і замацаванне графічных і граматычна-правапісных нормаў беларускай літаратурнай мовы ў 20 – 30-я гады XX ст.
8. Гамілетычная літаратура. Казанні Стэфана Зізанія, Мялеція Сматрыцкага, ІаанікіяГалятоўскага.
9. Гістарычныя ўмовы фарміравання і асаблівасці развіцця новай беларускай літаратурнай мовы ў пачатку XIX ст.
10. Дзейнасць Васіля Цяпінскага. Мова яго твораў.
11. Дзейнасць Сымона Буднага. Мова яго твораў.
12. Кнігадрукаванне на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. Дзейнасць Ф. Скарыны.
13. Лексікаграфічная і тэрміналагічная праца ў 20-30-я гады XX ст.
14. Летапісанне на Беларусі ў XV – XVII стст. Мова беларускіх летапісаў.
15. Мова выданняў Ф. Скарыны.
16. Мова дзелавых помнікаў XIV – XVII стст. (граматы, статуты, судовыя дакументы).
17. Мова мастацкіх твораў XV – XVIII стст. Арыгінальная мастацкая літаратура (вершы А. Рымшы і С. Полацкага).
18. Мова мастацкіх твораў XV – XVIII стст. Перакладная мастацкая літаратура.
19. Мова мастацкіх твораў XV – XVIII стст. Сатырычныя творы "Прамова Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча".
20. Мова помнікаў усходнеславянскага пісьменства.
21. Мова помнікаў усходнеславянскага пісьменства. Дзелавы тып.
22. Мова помнікаў усходнеславянскага пісьменства. Кніжнаславянскі тып.
23. Мова помнікаў усходнеславянскага пісьменства. Народна-літаратурны тып.
24. Мова рэлігійных твораў XV – XVII стст. Бытавыя рэлігійныя творы "Страсці Хрыстовы", "Аповесць пра трох каралёў-вешчуноў".

25. Мова рэлігійных твораў XV – XVII стст. Пранікненне жывых моўных асаблівасцей у раннія рэлігійныя творы.

26. Паходжанне літаратурнай мовы ўсходніх славян (тэорыі А.А. Шахматава, С.П. Абнорскага, В.У. Вінаградава, Ф.П. Філіна).

27. Пераклад кананічнай літаратуры на Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII стст. Пераклады Ф. Скарыны і В. Цяпінскага.

28. Перакладныя слоўнікі XVI – XVII стст. Працы І. Фёдарава, Л. Зізанія, П. Бярынды.

29. Першыя беларускія выдавецтвы, газеты, часопісы, іх роля ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.

30. Пісьменства на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў XI – XIII стст. Дзейнасць Е. Полацкай і К. Тураўскага.

31. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў сучасных умовах.

32. Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў XVI – XVII стст. Першыя граматыкі.

33. Развіццё мовазнаўства на Беларусі ў XVI – XVII стст. Першыя кірылічныя буквары.

34. Стылі літаратурнай мовы ўсходніх славян (кніжнаславянскі, свецка-мастацкі, дзелавы).

35. Стылістычныя разнавіднасці старабеларускай літаратурнай мовы. Асноўныя групы літаратурна-пісьмовых помнікаў XIV – XVII ст.

36. Узнікненне пісьменнасці ва ўсходніх славян, сучасны стан пытання.

37. Умовы развіцця беларускага пісьменства ў к. XVI ст. – XVIII ст.

38. Утварэнне беларускай народнасці і яе мовы. Погляды вучоных на моўную аснову беларускай мовы.

39. Правапіс Б.Тарашкевіча, яго значэнне ў школьным навучанні і выдавецкай практыцы.

40. Першыя легальныя беларускія газеты “Наша доля” (1906) і “Наша ніва” (1906 – 1915), іх роля ў развіцці беларускай літаратуры і літаратурнай мовы.

41. “Мужыцкая праўда” К.Каліноўскага – першая беларуская газета.

42. Роля Ф.Багушэвіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Погляды пісьменніка на беларускую мову.

43. Роля В.Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. Погляд яго на беларускую мову і ролю пісьменніка.

44. Мастацкаялітаратура як галоўная сфера фарміравання і развіццяновай (сучаснай) беларускайлітаратурнаймовы. Моваананімныхтвораўпершайпаловы XIX ст.

45. Беларускія інтэрмедыі. Характар выкарыстання ў гэтых творах жывой гаворкі беларускага народа.

46. “Граматыка” І.Ужэвіча.

47. Буквары і граматыкі І.Фёдарава, Л.Зізанія, М.Сматрыцкага і іх роля ў акрэсліванні норм літаратурнай мовы і ў пазнейшай граматычнай распрацоўцы ўсходнеславянскіх моў.

48. Мова навуковых і палемічных твораў XVI – XVII стст. Значэнне прадмоў Ф.Скарыны ў станаўленні навуковага стылю.

49. Дзейнасць С.Буднага, І.Фёдарава, П.Мсціслаўца, братоў Мамонічаў. Скарынінскія традыцыі ў выдавецкай дзейнасці паслядоўнікаў першадрукара.

50. Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф.Скарыны ў Празе і Вільні.

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| 10 | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 9 | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 8 | Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 7 | Студэнт у дастаткова поўным аб’ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 6 | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| 5 | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; |

| | |
|---|---|
| | дапускае памылкі ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **4** | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае разважанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **3** | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы  з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **2** | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы  са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **1** | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы  са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| Старaславянская мова | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2021 |
| Беларуская дыялекталогія | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2021 |